БЕЛАРУСКАЯ МАЛАДЗЁЖНАЯ ГАЗЕТА

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

ВЫДАЕЦЦА З 1921 ГОДА

ВЫХОДЗІЦЬ ПА ПЯТНІЦАХ

№ 9 (13541)

24 лютага — 1 сакавіка 1992 года

Цана 1 рубель 50 кап. (па падпісцы — 35 кап.)

У нумары:

«Раскол у БНФ». Плёткі ці праўда? 3

"Пакуты "Пагоні". Вяртанне старажытных сімвалаў беларускага народа 7

"Мой прынцып — самаіронія". Інтэрв'ю з бардам В.Шалкевічам 11

"Людзі і прывіды". Рэпартаж з наркалагічнага аддзялення Рэспубліканскай псіхіятрычнай бальніцы 12

"Дом на ўскраіне". Гісторыя аднаго забойства 13

КУДЫ СКІРАВАЦЬ КАРАБЕЛЬ?

Узаемаадносіны заснавальніка і газеты... Цяпер, калі сам нячысцік не разбярэцца, каму належыць той ці іншы орган, калі кошт паперы і паслуг распаўсюджвальнікаў узняўся да астранамічных лічбаў, калі зарплата журналіста меншая за зарплату прыбіральшчыцы, найбольш востра стала пытанне аб выжыванні. Удзельнікі II пленума ЦК СМБ, які адбыўся 25 лютага, далі беларускай прэсе, што раней залежала ад волі маладзёжных лідэраў, зялёную вуліцу. Гэта выразілася ў тым, што ЦК СМБ адмовіўся ад заснавальніцтва часопісаў "Вясёлка", "Крыніца", выйшаў са складу заснавальнікаў часопіса "Маладосць", а таксама вырашыў перадаць правы заснавальніка газеты "Знамя юности" яе працоўнаму калектыву.

Няўжо ЦК усё ж такі вырашыў вызваліць ад свайго ўплыву маладзёжныя выданні? Не, да такога альтруізму ў ЦК СМБ яшчэ не дайшлі. Прычына самая прагматычная – няма грошай. Некаторыя з удзельнікаў пленума білі сябе ў грудзі, маўляў, як жа гэта мы кінем на волю лёсу нашы газеты? Але ўсе словы разбіваліся аб халодныя маўклівыя лічбы. Толькі ад адной "Знаменки" выдаткі дасягнуць 25 000 000 рублёў. Такіх сродкаў у СМБ няма. Як заявіў першы сакратар ЦК СМБ Аляксандр Фядута, "Знамя юности" не прападзе, і паказаў паперу, на якой чорным па беламу было напісана, што адна з фірм згодна стаць фундатарам газеты.

А што ж наша "Чырвонка"? У мінулым нумары мы заявілі, што хочам стаць незалежнымі. Справа ў тым, што мы былі незалежнымі заўсёды – незалежнымі ў сваім розуме, у сваёй душы. Цяпер, дзякуючы дзяржаўнай датацыі, на жаль, не поўнай, мы маем магчымасць стаць хоць крыху матэрыяльна незалежнымі. ЦК СМБ прапанаваў калектыву стаць сузаснавальнікам "Чырвонай змены". Відаць, так і будзе. Гэтае рашэнне абгрунтавана тымі матывамі, што ЦК Саюза моладзі Беларусі абавязаўся не рабіць на рэдакцыю ніякага націску, свае адносіны з ёй будаваць на базе партнёрства.

Алесь Палынскі.

ALFA

ПАПРОСТУ

Барон Мюнхгаўзен у папулярным тэлефільме "Той самы Мюнхгаўзен" заўважыў:"Усе глупствы на свеце робяцца менавіта з гэтым, сур'ёзным, выразам твару!" У нашым нумары і так, шаноўны чытач, дастаткова сур'ёзу. Таму мне хочацца скарыстаць права вета дзяжурнага рэдактара і ў гэтай калонцы распавядаць не пра глабальна-сур'ёзныя рэчы, а расказаць невялічкую цікавую гісторыю.

Неяк ехала ў таксі з жанчынкай. Слова за словам – пайшла гаворка пра цэны, грошы (яшчэ да падаражання). Таксіст – каржакаваты, вясковага выгляду дзядзька (рускія словы з выдатным беларускім вымаўленнем) распавёў пра выпадак, які не мог, як ён сказаў, успамінаць без шкадавання... Неяк падвозіў чарговую пасажырку. Тая расплацілася і шпарка пабегла прэчкі. Праехаўшы колькі часу, таксіст выпадкова зірнуў на падлогу. Там ляжаў кашалёк. Пацікавіўся змесцівам. Тысяча рублёў з гакам (да павышэння цэнаў! – ад аўт.). Ясна, што ён выслізнуў з рыдыкюля маладой пасажыркі. Адразу прыгадаў, што тая спяшалася на працу і дарожная гаворка ішла пра краму, тавар, куплю-продаж. Тармазнуў і вярнуўся на тое месца, дзе выйшла дзяўчына. Побач – прамтаварная крама. Зайшоў. Авохці! Сядзіць на касе нядаўняя пасажырка, з сяброўкай пра нештачка гаворыць, як ні ў чым ні бывала: відаць, яшчэ не спахапілася. Тут наш таксіст да яе. Ці не ваша,кажа, згуба. Тая далонькамі пляснула, вохнула, дзякуй, маўляў. А наш расказчык не будзь прастаком, намякае – нядрэнна было б на каньячок даць. Тая яму адшукала ў стосе купюр чырвонец. Дзядзька скрывіўся. Малавата, але што зробіш, дoранаму каню ў зубы не глядзяць. Сеў за руль і задумаўся... Пакуль вёз грошы, аддаваў, аніякіх сумненняў і блізка не было. А аддаў – відаць, д'ябал стаў ягоныя думкі блытаць. Пашкадаваў, далібог, пашкадаваў. І з таго часу не дае яму спакою гэтая тысяча рублёў. Як падумае, што мог бы пакінуць сабе, і аніхто б пра гэта не ведаў, ледзь не плача ад прыкрасці.

Жанчынка, мая спадарожніца, пачала павучальна даводзіць таксісту: "Вы можаце быць абсалютна ўпэўненыя – гэтыя грошы вам нізавошта не прынеслі б дабра. Вы правільна зрабілі. За гэта вам адплаціць Бог. Вы душу сваю выратавалі, устаялі перад спакусай". Пад час гэтай пропаведзі дзядзька згодна хітаў галавой. І пачало ўжо здавацца, што прасякнутыя боскасцю словы, нарэшце, пазбавілі ад пакут мяцежную душу. Нат падалося – вось-вось німб зазіхаціць над ускалмачанай дзядзькавай галавой. Ён глыбока ўздыхнуў... Мы падрыхтаваліся пачуць удзячнасць за "настаўленне на шлях ісцінны" і..."правільна вы кажаце, але... усё-такі шкада тых грошай, ажно тысяча рублёў". Мне стала смешна: такі кантраст паміж узнёсла-натхнёным, насычаным духоўнай верай маналогам і шчырым шкадаваннем, што "дзякуй" за пазуху не пакладзеш. Гэткі ж кантраст паміж нашымі найлепшымі памкненнямі і непрывабнай рэчаіснасцю І ўсё-ткі... Людцы, любіце адзін аднаго такімі, якія вы ёсць на самай справе: з усімі вашымі слабасцямі, недахопамі. Нам бракуе дабрыні. Мы задыхаемся без яе ў гэтым невыносна жорсткім свеце. Не будзем жа пазбаўляць адзін аднаго апошняй надзеі, шматочку кволай веры...

Алена Агібалава.

Актуальны рэпартаж

ПІЦЬ АБО НЕ ПІЦЬ?..

Зусім нядаўна, усяго некалькі гадоў таму, у нашай краіне (тады яшчэ СССР) была распачата антыалкагольная кампанія. Крыху пазней мы пачулі пра высечаныя па-варварску вінаграднікі, пра загубленае абсталяванне з вінна-гарэлачных заводаў, пра тое, колькі людзей пацярпела ад гэтага.

Зараз крыху адумаліся. Зноў адкрываюцца вінна-гарэлачныя заводы, зноў абсталёўваюцца... А як жа адчуваюць сябе ў гэтай кругаверці людзі, якія непасрэдна звязаны з "зялёным змеем", людзі, што выпускаюць гарэлку? Для таго, каб адказаць на гэтае пытанне, я звярнуўся да Юрыя Анісімавіча Піліпенкі, дырэктара галаўнога завода "Крышталь":

— А каму гэта ўсё цікава? Вам? Ці, можа, чытачам? А нам гэта нецікава. Зараз усе кінуліся нас абараняць. А нас трэба было адстойваць раней, калі пачалася барацьба з п'янствам. Цяпер ужо нават надакучылі "заступнікі". Лепш пагаворым пра тое, што чакае нас наперадзе. Пачну хаця б з таго, што катастрафічна не хапае посуду. А шклозаводы не працуюць. Вось і выкручвайся як хочаш. Менавіта таму, з-за недахопу посуду, шмат гарэлкі выпускаецца ў піўных бутэльках. Не лепш выглядаюць справы і з перавозкамі: у краіне няма поліэтылену — няма і скрынь. А калі няма скрынь, дык няма як і гарэлку перавозіць... Кінулі выпускаць абсталяванне для вінна-гарэлачных заводаў.

— Але не апускаць жа рукі?

— Зараз мы робім усё, што магчыма. Прапануецца штогод выпускаць тры мільёны дэкалітраў гарэлкі (1 дэкалітр — гэта 10 літраў). Гэта толькі на "Крышталі". Атрымліваецца прыкладна два дэкалітры (сорак бутэлек) гарэлкі ў год на кожнага жыхара Мінска. Зараз асвоілі вытворчасць гарэлкі "Белая Русь", якая гатуецца на спірце павышанай якасці. Гэта выдатная гарэлка, але аўтарытэт яе яшчэ маленькі: яе выпускаюць пакуль што няшмат.



У сувязі з тым, што рэзка ўзрос кошт вінаматэрыялаў, мы адмаўляемся ад іх, а будзем выпускаць настойкі з нашай беларускай сыравіны. Такія, напрыклад, як "Зуброўка", "Белавежская", "Налібокская", "Заслаўская" (яны настоены на травах). Яшчэ трэба дадаць, што магутнасць "Крышталя" дае нам магчымасць павялічыць выпуск гарэлкі прыкладна на 5 працэнтаў, што мы і плануем рабіць. Толькі быў бы посуд і... спірт.

Ю.А.Піліпенка дадаў, што пры сённяшнім вар'яцкім росце цэн выпуск гарэлкі можа стаць нерэнтабельным."Крышталь" пакуль што выкарыстоўвае наш беларускі спірт, які каштуе 120—170 рублёў за дэкалітр. А вінна-гарэлачныя заводы Брэста і Гомеля, якія закупляюць спірт на Украіне, знаходзяцца ўжо на мяжы спынення з-за цэн на сыравіну. А што можна зрабіць для таго, каб знізіць цэны на спірт? Адказ адзін: знізіць цану на збожжа. Калі раней тона яго каштавала 500—700 рублёў, то зараз дасягае 7—9 тысяч. А пры такім кошце выпуск спірту нерэнтабельны. Так што не спяшайцеся хаваць самагонныя апараты. Будзем самі вырашаць пытанне: піць або не піць.

Ф.Лявіцкі,
студэнт журфака БДУ.

Моладзь і час

АПТЫМІСТЫЧНЫ НЕКРАЛОГ

Відаць, многія з жыхароў Беларусі і не ведаюць, што існуе ў нашай рэспубліцы маладзёжная арганізацыя, якая замяніла камсамол. Але камсамольская спадчына не згінула, і аб гэтым сведчыць другі пленум ЦК СМБ, які адбыўся ў аўторак, 25 лютага.

А пачалася гэтая імпрэза з заявы двух сакратароў ЦК – Асіпенкі і Барэйкі аб тым, што яны саступаюць свае месца іншым. Аляксандр Фядута, першы сакратар ЦК, прапанаваў свае кандыдатуры, але... прадстаўнікі апарату, які на месцах скараціўся часам на дзве траціны, не пагадзіліся з тым, каб колькасць сакратароў ЦК засталася ранейшай. Апаратныя пертурбацыі скончыліся такім чынам: пасаду двух сакратароў заняў адзін чалавек – былы сакратар камітэта камсамола БПА Сяргей Даронін, а пасаду другога сакратара заняў Валерый Варанецкі. Пасля дыскусіі я ўзяў невялічкае інтэрв'ю ў Аляксандра Фядуты. Ён заявіў, што ніякай рэвалюцыі, ніякага расколу не адбылося, як не адбылося кардынальнай змены курсу арганізацыі. Проста ідзе працэс "прыцірання" першага сакратара і бюро. "Мы вучымся працаваць разам,– адзначыў А.Фядута.– У дэмакратычнай атмасферы пленума парушаецца няпісаная традыцыя – члены бюро ўжо выступаюць, не азіраючыся на першага сакратара". На пытанне, як ён ставіцца да групы Сяргея Вазняка, А.Фядута адказаў: "Бог з імі, хай жывуць. Я быў на іх з'ездзе, згодны з імі не ва ўсім, але яны маюць права адстойваць свае перакананні. А наконт таго, што ЛКСМБ жадае стаць калектыўным членам СМБ, я магу сказаць адно: ЛКСМБ – грамадска-палітычная арганізацыя, а, паводле нашага статута, мы палітыкай не займаемся. Тут чыста юрыдычная супярэчлівасць".

Калі сказаць шчыра, на пленуме не было вызначана ніякіх шляхоў для захавання арганізацыі. Сапраўды, калі СМБ паставіла сваёй задачай сацыяльную абарону, дык яна і павінна гэтым займацца. Сацыяльная ж абарона каштуе такіх грошай, якіх у СМБ няма і ў перспектыве не будзе. Ці значыць гэта, што СМБ у тупіку? Можа і так. У наш час моладзь можа пайсці ў арганізацыю толькі тады, калі яна зможа ёй нешта даць. Прагматызм? Так, але менавіта на гэтым грунтуюцца словы А.Фядуты:"Асноўнае зараз для нас – гэта разумны сэнс і інстынкт самазахавання".

Хутчэй за ўсё, гэта не апошні пленум ЦК СМБ. Арганізацыя выкараскаецца. Але якія страты панясе – вядома аднаму толькі Богу. Таму і падобныя былі выступленні членаў ЦК на некралогі. Але на некралогі аптымістычныя.

А.П.

Тэлетайп

Цана: 1 зубр 50 зайцоў

Нягледзячы на сакрэтнасць, з якой у Беларусі вядзецца падрыхтоўка да выпуску ўласных грошай, з кампетэнтных крыніц стала вядома, што ўжо распрацаваны эскізы як шматразовых купонаў, так і паўнавартаснай нацыянальнай валюты. Мяркуецца, што на купонах будуць выявы жывёлін. Чым вышэй вартасць купона, тым буйнейшая і жывёліна: ад вавёркі да зубра. Што тычыцца паўнавартасных грошай, то іх упрыгожаць не толькі жывёліны, але і партрэты вядомых гістарычных дзеячаў Беларусі, а на 1000-й купюры будзе выява фрагментаў Грунвальдскай бітвы.

Улада для бізнесменаў

У Дзень Узброеных Сіл свой сапраўдны твар паказала дэмакратычнае кіраўніцтва Масквы. Насустрач несанкцыяніраванаму шэсцю жыхароў сталіцы, якія накіроўваліся ўскласці кветкі да магілы Невядомага салдата, быў кінуты мясцовы атрад міліцыі асобага прызначэння. Мірных дэманстрантаў білі дубінкамі – "дэмакратызатарамі" і ботамі, не шкадавалі нават жанчын.

Гэтым жа вечарам мэр горада Масквы Гаўрыіл Папоў з'явіўся на тэлеэкране ў перадачы "Палітычная кухня" і заявіў, што ўлада існуе не для нейкага надуманага камуністамі народа, а дзеля дапамогі бізнесменам і прадпрымальнікам, якія зробяць дзяржаву багацейшай.

У сям'і журналістаў — папаўненне

Узначаліўшы фонд свайго імя, Міхаіл Гарбачоў вырашыў пашчыраваць і на журналісцкай ніве. Былы дзяржаўны дзеяч СССР № 1 даў згоду рэгулярна пісаць каментарыі для турынскай газеты "Стампа". Будзем спадзявацца, што ганарары ў М.Гарбачова будуць значна вышэйшыя, чым у журналістаў "Чырвонай змены".

КУР'ЕР ТЫДНЯ

"ЛіМу" 60 гадоў. Віншуем! Зычым больш аптымізму ў наш нялёгкі час.

Мікола ГІЛЬ,
галоўны
рэдактар "ЛіМа"



Баліць сэрца...

Баліць само па сабе. Баліць і ад таго, што ўсё ў нас не як у людзей. Кульгае, бы надарваны конь, наша эканоміка, прадвяшчаючы суцэльную анархію вытворчасці. Шалеюць цэны, і мы, гледзячы на гэтае шаленства, сёння яшчэ няўцямна пасміхаемся, хоць заўтра,хутчэй за ўсё, заплачам. Загадзя забяспечыўшы сябе парашутамі, былыя партбосы розных узроўняў шчасліва апусціліся ў новыя крэслы, нібы ўсё жыццё толькі і рыхтавалі сябе да ролі банкіраў, менеджэраў, бізнесменаў.

А найперш ад таго баліць яно, што за гады савецкага гаспадарання запанавала паўсюль ленасць і абыякавасць душы нашых людзей, што летаргічным сном спіць наша нацыянальная свядомасць, што выраслі цэлыя пакаленні нацыянальных манкуртаў. Не збудзілі нас гады рабства, не выспелілі ў душах магутны і нязломны парыў да свабоды, творчасці і годнага чалавечага жыцця. Не збудзіла, не з'яднала нас і Чарнобыльшчына. Дык што ж нас урэшце скалане, згуртуе дзеля вялікай работы па адраджэнню, адбудове нацыі, па стварэнню незалежнай і дэмакратычнай Беларусі?

З гэтае прычыны і лімаўскі юбілей атрымліваецца невясёлы. 60 гадоў — ладны кавалак часу, ён увабраў у сябе мноства вялікіх і малых падзей, жыцці не аднаго пакалення, але абставіны ў гэтыя гады былі такія, што нішчылі плён работы, губілі кінутае ў гоні зерне, дратавалі ўсходы. Як ні горка гэта ўсведамляць, аднак жа міжволі даводзіцца сумнявацца: ці не сёння гэта напісаны балючыя, роспачныя купалаўскія радкі пра панскую трывогу, забітую з прычыны таго, што беларус азваўся сваім словам, ці, скажам, радкі Багдановіча пра абакрадзеную душу беларуса, у якой нават і мовы няма?!

Ды — маўчы, сэрца, сціскайся, трывай і працуй, покуль змога! Бо — трэба сеяць! Бо толькі сяўба — зарука жніва! Бо ніхто іншы нашай работы за нас не зробіць...

Міхась ЗАМСКІ,
рэдактар
аддзела
публіцыстыкі.

Мяне вельмі трывожыць пэўны раскол дэмакратычнага руху ў былым СССР, чаго, на жаль, не пазбегла і наша рэспубліка.

Застаецца толькі "радавацца", што партрэты Сталіна яшчэ не "лунаюць" над калонамі прыхільнікаў "камуністычнага шляху" на вуліцах гарадоў Беларусі, як гэта адбываецца ў Маскве, Пецярбургу, Саратаве, іншых мясцінах былога Саюза. Але няма гарантыі, што чырвона-карычневая чума не перакінецца на нашы абшары. І ў нашай рэспубліцы мацнее і пашыраецца сацыяльная база для рэакцыйных сіл. Чыкіны пастараюцца гэтую акалічнасць выкарыстаць.

Я пра гэта неаднойчы пісаў у "ЛіМе", паўтару яшчэ раз: па маім глыбокім перакананні, пасля жнівеньскіх падзей дэмакратычныя сілы зрабілі гістарычную памылку, не дамогшыся аб'яўлення КПСС, камуністычнай ідэалогіі па-за законам, як гэта было зроблена ў Нюрнбургу ў адносінах нацысцкай партыі Германіі.

Юрась СВІРКА,
загадчык
аддзела
паэзіі



Данчыку

...Як быццам ён прывёз жывую спадчыну,
Без выкупу яе перадае.
Ён песні беларускія, як матчыны,
На мове нашай салаўём пяе.

Дык што ж мы, без'языкія, зрабілі,
Хто абакраў нас, хто завёў у зман?
Як быццам, сваю песню мы згубілі,
Сплыла яна за мора-акіян.

Як быццам на чужыне засталася
Крычаць альбо маліцца ад душы,
Каб не прывозіць нам у блізкім часе
Жалейкавы свой голас з-за мяжы.

Партыі,рухі. Бег навыперадкі

Раскол у БНФ

Плёткі ці праўда?

"Выйшлі мы ўсе з Народнага..."

Спадар Алег ТРУСАЎ, намеснік Старшыні Цэнтральнай Рады БСДГ – Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады, сябра Сойму БНФ, намеснік сп.Зянона Пазняка па парламенцкай апазіцыі. Дарэчы, да шэрагу пасад варта дадаць ледзь ці не самую галоўную (для дадзенага *моманту) місію Алега Трусава: сярод 35-ці* чалавек, што ўтварылі гадоў колькі таму аргкамітэт БНФ, быў і Алег Анатольевіч. Чытайма ж каментар спадара Трусава да цяперашніх зносін паміж бэнэфаўцамі і грамадоўцамі:

– Адносіны засталіся тыя ж, якія й былі – на мінулым узроўні. Дый нелагічна чакаць іншага: касцяк Фронту, сябры БНФ на дзве трацiны – грамадоўцы. Заўважу, не проста сябры, а менавіта актывісты БНФ. Шэсць ці сем прадстаўнікоў Грамады з'яўляюцца нават сябрамі фронтаўскага Сойму. Такім чынам, у Грамады самая моцная партыйная фракцыя ў кіраўніцтве БНФ. Сёння некаторыя журналісты вельмі хочуць пасварыць Фронт і Грамаду. За спінамі першых – зацікаўленыя ў звадцы паміж дэмакратычнымі плынямі сілы. Яны выдаткоўваюць, як стала вядома апошнім часам, шмат грошай на кампанію нацкоўвання руху на дэмакратычныя партыі і наадварот.

– У вас ёсць канкрэтныя факты?

– Зразумейце, гэта ж не выглядае так, як у нейкім бальшавіцкім рамане: прыязджае агент ЦРУ з напакаваным грашыма чамаданчыкам і некага падкуплівае...

– Я ўсвядоміла, што канкрэтныя прыклады вы не назавяце.

– Пакуль што проста не магу. Грамада – адна з самых вялікіх партыяў, якая неадступна і няўхільна ідзе да незалежнасці Беларусі на нацыянальным грунце. У нас (грамадоўцаў і фронтаўцаў) – сапраўдны плюралізм думак і палітычных поглядаў у адрозненне ад былой КПБ–КПСС. У Пазняка – свой погляд, у Ткачова – свой і г.д. Такая з'ява нармальная. Насцярожваць павінна якраз адваротнае. Таму аніякага размяжоўвання паміж Фронтам і Грамадой на самай справе не было і няма.

– Юры Хадыка ўпікнуў Грамаду ў супрацоўніцтве з "афіцыйнымі" прафсаюзамі. Ваша стаўленне да гэтай заўвагі?

– Сацыял-дэмакраты заўсёды вызначаліся сваёй спагадай да прафсаюзаў. Увогуле без супрацоўніцтва з прафсаюзамі сацыял-дэмакратыя ня можа існаваць. На сёння Грамада кантактуе з двума прафсаюзнымі супольнасцямі: у галіне радыёэлектронікі і машынабудавання. Які з іх "афіцыйны"? Так, напрыклад, адзін з кіраўнікоў азначаных саюзаў спадар Бухвостаў зарганізоўваў першыя страйкі ў Гомелі.

– Мо спадар Хадыка мае на ўвазе стварэнне блоку "Новая Беларусь", ініцыяванае Грамадой?

– У гэтым блоку, акрамя двух азначаных, маецца яшчэ Саюз прадпрымальнікаў (вось гэты, дарэчы, ужо дакладна ніяк не стасуецца да слова "афіцыйны"). Акрамя трох прафесійных саюзаў, у "Новую Беларусь" увайшлі таксама: уласна Грамада, Сялянская партыя, Саюз "Чарнобыль", астатнія ж – са статусам назіральнікаў, у тым ліку і БНФ. Дарэчы, назіральнікам ад БНФ з'яўляецца спадар Хадыка. Няхай часцей прыходзіць на пасяджэнні "Новай Беларусі" (смяецца). На сённяшні дзень, лічу, наогул немэтазгодна ўжываць азначэнне "афіцыйныя прафсаюзы", бо ўсе яны, нават згуртаванне Міхаіла Собаля, з'яўляюцца афіцыйна зарэгістраванымі.

– Грамада, як вядома, не адразу далучылася да заявы аб падтрымцы рэферэндуму, што, пэўна, і паслужыла для журналістаў падставай у меркаваннях наконт расколу БНФ?

– Грамада папросту не магла далучыцца тэрмінова, бо па Статуту неабходна папярэдне абмяркоўваць кожнае пытанне на Цэнтральнай Радзе і выносіць рашэнне супольна. Прыкладна трыццаць працэнтаў "радаўцаў" выказалася супраць рэферэндуму, большасць – за. Грамада не збіраецца нават для самых святых дэмакратычных мэтаў пераступаць праз унутрыпартыйную дэмакратыю. Падводжу рыску пад вышэй сказанае: аніякага расколу паміж БНФ і Грамадой няма. Ёсць сапраўдная шматпартыйнасць, плюралізм у меркаваннях.

– На гэтым вынёску, пэўне, і спынімся. Дарэчы, незалежна ад вас, падобную думку выказаў нашаму карэспандэнту спадар Хадыка.

Замест фіналу. Ясна адно: Фронт і Грамада не збіраюцца паўтараць сумнавядомы таталітарны вопыт Кампартыі і дасягаць адзінства сваіх шыхтоў самымі неверагоднымі чыннікамі. Да таго ж абедзве сілы не грашаць "падпольшчынай": імкнуцца не да знешняга аднадумства (што, канешне, было б больш выгадным ва ўмовах далейшага супрацьстаяння розных палітычных сіл), а да сапраўднай, няхай сабе і з шурпатасцямі, згоды.

Чутку правярала
палітычны рэдактар "ЧЗ"
Алена Агібалава, тэл.39-87-94.

Фота С.Брушко.

«Чалавек мусіць мець свабоду волі»

Юры ХАДЫКА, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, загадчык лабараторыі Інстытута фізікі АН Беларусі. Намеснік Старшыні Беларускага Народнага Фронту.

– Людзі, арганізацыі, партыі, якія ўвайшлі ў блок "Новая Беларусь", маюць шчыльныя сувязі з БНФ. У дэмакратычным руху Беларусі існуюць розныя плыні. На мой погляд, прычын утварэння такой сітуацыі некалькі. Па-першае, пэўная частка людзей, якія ў свой час дзейнічалі ў складзе Фронту, палічылі неабходным пашырэнне сацыяльнай базы дэмакратычнага руху. Сёння гэта робіцца шляхам далучэння да яго прафесійных саюзаў. І тут узнікла першае адрозненне паміж сацыяльнымі бакамі БНФ і партыямі, што стварылі новы блок. У склад апошняга ўвайшлі прадстаўнікі афіцыйных прафсаюзаў.

На мой погляд, гэта рызыкоўная палітыка. Мы не збіраемся даваць ацэнку людзям, якіх лічым за сваіх паплечнікаў, але ў паведамленні Управы БНФ, якая была падтрымана на пасяджэнні Сойму, ясна сказана: супрацоўніцтва з афіцыйнымі прафсаюзамі – учарашняй "школай камунізму" – стварае магчымасць удзелу ў палітыцы былое камуністычнае наменклатуры, хай не найвышэйшага ўзроўню. У адрозненне ад "Новай Беларусі", для БНФ такое пашырэнне не з'яўляецца магчымым, бо гэтыя арганізацыі, нягледзячы на сваю масавасць, ня ёсць сапраўдныя прадстаўнікі інтарэсаў рабочых. Гэта паказалі вынікі мінулагодняй хвалі красавіцкіх страйкаў, а таксама іхнія спробы абараніць рабочых у перыяд павышэння цэнаў. Фронт у сваёй дзейнасці апіраецца на маладыя, сапраўды дэмакратычныя структуры рабочага руху – незалежныя прафсаюзы, сацыяльная і палітычная арыентацыя якіх нам вельмі блізкая.

Другая прычына падзелу ў дэмакратычным руху, на мой погляд, выключна суб'ектыўная. Напрыканцы васьмідзесятых гадоў, пад час свайго ўтварэння, Фронт быў адзінай апазіцыйнай арганізацыяй КПБ–КПСС на Беларусі. Ён злучыў усе палітычныя сілы, што знаходзіліся ў стане супрацьстаяння да ўлады. Але ва ўсім свеце дэмакратычныя рухі, якія не аб'ядноўвае жорсткая дысцыпліна таталітарных партый, распадаюцца на розныя плыні. Гэта нармальная з'ява. Чалавек ва ўмовах дэмакратычнага грамадства мусіць мець свабоду волі, ён будзе імкнуцца да найбольш поўнай рэалізацыі сваіх поглядаў і памкненняў. І калі людзі, што стаялі ля вытокаў дэмакратычнага руху рэспублікі, імкнуцца ажыццявіць свае намеры стварэннем новага палітычнага блоку, мы не лічым мэтазгодным з імі змагацца.

Дарэчы, тыя, хто імкнецца да самавыяўлення, таксама разумеюць неабходнасць аб'яднання. Менавіта гэтым і спароджаны блок "Новая Беларусь".

Я мушу падкрэсліць пазіцыю БНФ адносна палітычных аб'яднанняў. Дзеля іхняга ўтварэння павінны існаваць рэальныя палітычныя ўмовы і матывы. Зараз, калі пачаўся збор подпісаў за рэферэндум і сталася рэальнасцю магчымасць новых выбараў у Вярхоўны Савет Беларусі, стварэнне новага блоку палітычных партый можна разглядаць як іхняе аб'яднанне перад выбарчай кампаніяй. Палітычная сітуацыя ў Беларусі вызначаецца адсутнасцю партый правага накірунку, якія існуюць, бадай, ва ўсіх рэспубліках былога СССР. У такіх умовах магчыма ўзмацненне ўплыву партый лева-цэнтрысцкай арыентацыі, якія, на мой погляд, прадстаўляе "Новая Беларусь". БНФ – надпартыйнае аб'яднанне цэнтрысцкага накірунку, не ўвайшоў у блок па шэрагу прычын, галоўная з якіх тая, што Фронт карыстаецца дастатковым уплывам, каб прымаць удзел у жыцці рэспублікі ў якасці самастойнае палітычнае сілы.

Як бы ні разваліся падзеі ў палітычным жыцці Беларусі, трэба зазначыць: размежаванне, якое існуе паміж дэмакратамі, наўрад ці створыць перашкоды дзейнасці апазіцыі. Падставаў да супольнае дзейнасці існуе значна больш, чым для разыходжанняў.

Занатаваў Уладзя Панада.

Фота аўтара.

ДА "НОВАЙ ЗЯМЛІ"

пры дапамозе дзядзькі Міхася з Кліўленда

Сёння ўжо не толькі заходнія краіны без вялікай ахвоты выкладваюць грошы на фінансавую і матэрыяльную падтрымку суверэнных дзяржаў былога СССР, але і самі дзяржавы не жадаюць прымаць бляшанкі з тушонкай і ношаныя рэчы. Просяць дапамогі больш дзейснай, напрыклад, тэхналогіямі. І ў гэтым сэнсе прыезд на Беларусь Міхася Белемука з Кліўленда можна лічыць першым крокам на шляху да больш сур'ёзных узаемаадносін паміж Беларуссю і ЗША. Міхась Белямук з'яўляецца заснавальнікам калоніі беларусаў у Кліўлендзе, аб'яднання маладых беларусаў ЗША, выдаўцом культурна-асветніцкага часопіса "Полацак". Але што самае галоўнае – паўнамоцным прадстаўнікам (на час вандроўкі) губернатара штата Агайо.

– Дзядзька Міхась, з якой мэтаю вы прыехалі на Беларусь, чым плануеце займацца?

— Мэты мае можна падзяліць на прыватныя і афіцыйныя. Пачну, відаць, з прыватных — яны для мяне больш прыемныя. Па-першае, даўно хацелася наведаць Бацькаўшчыну. Я чалавек ужо немалады і невядома, ці пашчасціць яшчэ калі пабачыць зямлю свайго дзяцінства. Па-другое, я ўжо шмат год вяду перапіску з тымі беларусамі, якія блізкія мне па поглядах і памкненнях. Гэта такія адраджэнцы, як Чарняўскі, Штыхаў, Цітоў, Ермаловіч. І я хацеў пабачыць і прыватна пазнаёміцца з тымі, каго я ўжо даўно ведаю па перапісцы. Але ёсць і афіцыйныя мэты майго прыезду. Пасля таго, як Беларусь набыла палітычную незалежнасць, узнікла надзённая неабходнасць набыцця ёю эканамічнай незалежнасці і стабільнасці. Для гэтага, на мой погляд, неабходна дапамагчы Беларусі ўвайсці ў міжнародны сусветны гандаль. Неабходна гэта і для таго, каб вам не стаць проста дадаткам да развітых заходніх дзяржаў, пастаўшчыком таннай сыравіны і працоўнай сілы. Мы вырашылі дапамагчы вам стварыць умовы для гандлю вашымі таварамі на заходнім рынку. За апошнія некалькі дзён я меў шмат сустрэч у розных міністэрствах. Сустракаўся з міністрам замежных спраў Беларусі Краўчанкам. І мы ўжо вызначылі канкрэтныя прапановы, выконваць якія пачнём у бліжэйшыя месяцы.

– Але ж пануе такое меркаванне, што прадукты нашай вытворчасці маюць значна ніжэйшую якасць, чым заходнія?

— Вымушаны з гэтым не пагадзіцца. Узяць, напрыклад, "Белавежскую" гарэлку. Па сваіх смакавых якасцях, па паху яна нашмат перавышае віскі, якія прадаюцца зараз у Амерыцы. Але ж Амерыка мае багаты выбар — больш за 120 сартоў віскі стаіць на паліцах яе крам. Мы думаем запрапанаваць амерыканскім магазінам першую партыю "Белавежскай" для продажу і, калі гандаль пойдзе паспяхова, мяркуем наладзіць пастаянныя пастаўкі гарэлкі ў Амерыку. Другі тавар, на які мы звярнулі ўвагу, — ільняныя вырабы. Сёння ў Амерыцы адыходзіць мода на сінтэтычную тканіну, і калі своечасова наладзіць пастаўкі добрай і якаснай ільняной прадукцыі з Беларусі, дык можна мець вялікі прыбытак. Адразу пасля свайго прыезду ў Кліўленд я мушу дасылаць на тэкстыльныя фабрыкі Беларусі ўзор тых расфарбовак і фасонаў, якія больш падабаюцца амерыканцам, для таго, каб ваша прадукцыя адпавядала ўсім патрабаванням не толькі па якасці, але і па густах. І апошняе, на чым мы спынілі свой выбар, — гэта драўляныя вырабы, дасланыя з Бярэсця. Выдатныя шкатулкі з цудоўнай інкрустацыяй і расфарбоўкай, я ўпэўнены, будуць мець камерцыйны поспех. Акрамя таго, гэта будзе і дадатковая праца людзям: мы плануем вывозіць на продаж вялікія партыі.

– Дзядзька Міхась, як вы мяркуеце, на што пойдзе прыбытак?

— Па нашых умовах, заробленая валюта пойдзе на пабудову санаторыяў, дзе будуць лячыцца дзеці з пацярпеўшых ад аварыі на ЧАЭС зон, на аднаўленне вытворчасці і іншыя справы, якія дапамогуць Беларусі выйсці на сусветны рынак і выпускаць добрую і якасную прадукцыю. Да таго ж гэта павысіць узровень жыцця беларусаў.

– Але, згадзіцеся, значна лягчэй сядзець у закуточку і чакаць, пакуль заходнія краіны выдзеляць нам нейкую фінансавую дапамогу, на якую мы і будзем будаваць санаторыі і г.д.?

— Усё, што адбываецца сёння, — гэтыя самалёты з ежай, адзеннем, падобна да жабрацтва. Мы, беларусы Кліўленда, не жадаем, каб да Беларусі ставіліся, як да краіны жабракоў. Губернатар нашага штата, славенец па паходжанню, падтрымаў нашыя думкі і нашыя ідэі, і мы вырашылі наладзіць пастаянныя кантакты паміж Беларуссю і штатам Агайо. Тым больш, што яны вельмі падобныя па сваіх эканамічных накірунках развіцця. На заканчэнне свайго візіту тут я мяркую сустрэцца з прэм'ер-міністрам В.Кебічам і хачу запрапанаваць яму падпісаць афіцыйную згоду паміж штатам і вашай краінай. У любым выпадку кантакты будуць, яны будуць пашырацца і павінны прынесці выгаду як Беларусі, так і нашаму штату.

Зміцер Лукашук.

Перыяд вакханаліі

Той, хто сачыў за публікацыямі Ул.Лемеха ў №№ 6-7 "ЧЗ", не мог не адзначыць арыгінальнасці яго разважанняў. Параўноўваючы нашу дзяржаву з вялікім калгасам, Лемех разважаў, якія функцыі ў ім выконваюць грошы і падаткі, цэны і занятасць. Сёння – заканчэнне гаворкі.

• ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ — нававядзенне, з якім звязваюць вялікія надзеі на развіццё гандлю і бізнесу.

Наменклатура ўжо даўно занялася прыватызацыяй абаротных сродкаў. Прыватны і кааператыўны сектары, савецкія біржавікі (асабліва маскоўскія) таксама маюць немалыя назапашванні саўзнакаў.

Увогуле пэўная частка "адзінага" калгаснага калектыву гатова перайсці да калгаснага рынку.

Радавым калгаснікам прыватызацыю не зразумець. Вопыт мінулага падказвае ім, што дурылі іх раней, дураць цяпер і з прыватызацыяй надураць. Дый не тыя ў іх фінансавыя магчымасці.

Глыбока памыляюцца тыя, хто лічыць, што прыватызацыя ліквідуе стары дзяржаўны лад, які ў нас называецца Савецкай уладай. І маюць рацыю тыя, хто з непадробным жахам думае аб вакханаліі вакол маёмаснага падзелу, калі разам з калгаснікамі з'явяцца калгаснікі-капіталісты, бізнесмены, біржавікі, г.зн. калгасны капіталізм.

Прыватызацыя ў сістэме калгаснага дзяржаўнага ладу магчыма, але яе мэта зусім у іншым: аптымізаваць і пераразмеркаваць занятасць калгаснікаў паміж грамадскай і індывідуальнай (сямейнай) вытворчасцю без права свабоднага гандлю і канкурэнцыі апошняга з грамадскім сектарам вытворчасці. Па заходніх мерках гэта зусім не прыватызацыя.

Прыватызацыю па заходняму ўзору (акцыяніраванне, продаж і г.д.) немагчыма выканаць, бо адсутнічаюць грошы — індыкатар кошту рэчы. Прыватызацыя, якая базіруецца на савецкай грашовай сістэме (рублі) абсурдная, бо грошы-боны прызначаны не для куплі-продажу або гандлю маёмасцю. Саўзнакі — гэта перш за ўсё працоўныя грошы. А вось камерцыйныя, гаспадарча-разліковыя грошы, грошы чорнага рынку чакаюць прыватызацыі. Яны здольныя нанесці смяротны ўдар рублю-бону і зменшыць тым самым каштоўнасць працы ў грамадскай гаспадарцы да катастрафічнага ўзроўню. Камерцыйна-гасразліковыя грошы, фальшывыя грошы. Іх вартасць бачна паўсюль. Так за 1—2-пакаёвую кватэру запатрабуюць сёння 1—5 мільёнаў рублёў.

Прыватызацыя і саўзнакі як агонь і вада. Балансавы кошт маёмасці вытворчых падраздзяленняў калгаса (прадпрыемстваў) паказаны ў рублях,— гэта кошт, у якім няма рэальнага грашовага эквіваленту. Рубель камерцыйны, рубель біржавы — гэта іншы рубель і ён патрабуе іншай цаны.

Такім чынам, прыватызацыя на Беларусі не перадумова ліквідацыі існуючага дзяржаўнага ладу, а яго вынік.

• КАМЕРЦЫЙНЫЯ БАНКІ

Стварэнне камерцыйных (гасразліковых) банкаў, заснавальнікамі якіх выступаюць буйныя дзяржаўныя падраздзяленні і іх ведамствы, адлюстроўвае этап "капіталізацыі" савецкай эканомікі. У гэтай прабледме можна выдзеліць два аспекты: юрыдычны і эканамічны.

Камерцыйная дзейнасць прадпрыемстваў, якія маюць статус падраздзяленняў калгаснай вытворчасці, адлюстроўвае чарговы юрыдычны нонсенс. Так званыя заснавальнікі самі не маюць заснавальнікаў і правапераемнасці, і таму правы той ці іншай службовай асобы распараджацца ад імя прадпрыемства свабоднымі грашовымі сумамі пазбаўлены ўсялякага сэнсу. Гасразліковая дзейнасць не мае норм асабістай маёмаснай адказнасці пры ажыццяўленні здзелак.

Эканамічным вынікам камерцыялізацыі грошай-бонаў з'яўляецца павелічэнне працэнтных ставак за крэдыт, і як вынік — рост цэн, падзенне рэнтабельнасці інвестыцый. Дзяржаўная бухгалтэрыя, страціўшы частку грошай, зніжае аб'ёмы цэнтралізаваных фандуемых капітальных укладаў у будаўніцтва. Рубель-бон у пагоні за нормай прыбытку (працэнт за крэдыт ужо дасягнуў 20—25 працэнтаў) ставіць пад пытанне рэспектабельнасць інвестыцый і зваротнасць крэдыту, калі яна ідзе ў сферу матэрыяльнай вытворчасці. На змену формуле Г-Т-Г+Г (зроблена на падставе вядомай усім высновы: грошы-тавар-грошы), дзе Г — прэмія за працу, прыходзіць формула Г-Г+Г, у якой Г — вынік публічнай спекуляцыі калгасным абаротным капіталам.

• ВЫВАДЫ. Калгасная вытворчасць і існуючы дзяржаўны лад стаяць на развілцы каля трох дарог.

Адна дарога вядзе да аптымізацыі ўнутрыкалгаснай дэмакратыі, занятасці работнікаў у грамадскай і прыватнай вытворчасці. Прыватны сектар калгаса ў структуры вытворчасці і паслуг пачынае займаць большую ўдзельную вагу, чым раней. Уся дзейнасць дэмакратычна выбранага праўлення накіроўваецца на гарманізацыю ўнутрыкалгасных працоўных адносін на аснове ўласнай зацікаўленасці калгасніка. Знімаюцца ўсялякія абмежаванні на памеры ўласнай падсобнай гаспадаркі, а занятасць "на сябе" ўключаецца ў грамадскую занятасць. Як вынік, у работніка з'яўляецца магчымасць выбару ў межах калгаснай структуры кіравання.

Дадзены шлях не вядзе да рынку і капіталізму, але ён супыняе развал калгаса.

Другі шлях, выбраны намі, вядзе да развалу калгаснай сістэмы на аснове ўкаранення рынку ў савецкі дзяржаўны лад, калгасна-саўгасную сельскую гаспадарку. Тут разам з грамадскай сістэмай калгасных каштоўнасцей узнікае праслойка калгаснікаў-псеўдападпрымальнікаў, ствараюцца лжэбіржы і іншыя элементы рынку на савецкі лад.

У выніку элементы адзінай калгаснай сістэмы ўступаюць у супярэчнасць, страчваюць звычайную дапасаванасць. Адбываецца паступовы развал сістэмы, што не вядзе да стварэння новага дзяржаўнага ладу і гаспадарчага ўкладу жыцця.

Трэці шлях вядзе да ліквідацыі старога дзяржаўнага ладу і калектыўнага спосабу вытворчасці, да заснавання грамадзянскага таварыства і прадпрыемстваў, нацыянальнай валюты і г.д. Гэта шлях у будучае Беларусі.

Каб пайсці па гэтаму шляху, патрэбна не так ужо і шмат:

1) стварыць ліквідацыйныя камісіі ў цэнтры і на месцах, устанавіць ліквідацыйны перыяд (1—3 гады) па ліквідацыі калгаснай сістэмы вытворчасці тэрытарыяльна-ведамаснага кіравання;

2) задаволіць усе прэтэнзіі крэдытораў за кошт існуючых грашовых сродкаў дзяржавы, выявіць дэбіторскую запазычанасць;

3) у ліквідацыйны перыяд павінны спыніць сваю дзейнасць органы Савецкай улады (абл- і райвыканкомы, сельскія Саветы), Вярхоўны Савет, цэнтральны ўрад і яго ведамствы;

4) у ліквідацыйны перыяд патрэбна правесці заснаванне органаў мясцовага самакіравання і падраздзяленняў грамадскай вытворчасці.

Ацэнка калгаснай маёмасці павінна ажыццяўляцца на аснове ўласнай нацыянальнай валюты або сертыфікатаў, якія павінны быць у будучым абменены не на рублі, а на новыя грошы;

5) закрыць калгасныя касы і бухгалтэрыі, выдаць пайкі, разарваць усе працоўныя адносіны з калгаснікамі. Калгаса няма, значыць няма і калгаснікаў;

6) правесці выбары ў прадстаўнічыя органы новай улады на аснове новага выбарчага права і Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Дзейнасць ліквідкомаў гэтым не абмяжоўваецца. Існуе яшчэ шмат функцый практычнай, распараджальнай і выканаўчай працы, якую нельга акрэсліць адной газетнай публікацыяй. Але думаю, што ідэя непрымусовай змены існуючага дзяржаўнага ладу будзе зразумела чытачам, бо кожны дзень мы адчуваем на сабе яго згубны ўплыў.

Ул. Лемех,
эканаміст.

Ад рэдакцыі: Высновы, безумоўна, спрэчныя. Хто будзе ўваходзіць у гэтыя "ліквідкомы"? Каму яны будуць падпарадкоўвацца? Шмат пытанняў застаецца нявырашанымі. Дый увогуле, усё гэта нагадвае 1917 год. Але ці мажліва бальшавіцкімі метадамі пабудаваць квітнеючае, дэмакратычнае грамадства? Мэта ў такіх выпадках не спраўдвае сродкі. А што вы, шаноўныя спадарства, думаеце на гэты конт?

Фота С.Брушко.

Краіны, прызнаўшыя незалежнасць Рэспублікі Беларусь

"Якія краіны прызналі Рэспубліку Беларусь з часу абвяшчэння ёю незалежнасці?

У.Бабpoў, г.Гомель".

1991 г.	
16 снежня	Рэспубліка Турцыя
20 снежня	Мангольская Народная Рэспубліка
	Румынія
	Каралеўства Швецыя
23 снежня	Рэспубліка Балгарыя
	Швейцарская Канфедэрацыя
	Чэшская і Славацкая Федэратыўная Рэспубліка
24 снежня	Каралеўства Нарвегія
25 снежня	Дзяржава Ізраіль
	Ісламская Рэспубліка Ірак
	Канада
26 снежня	Аўстралія
	Федэратыўная Рэспубліка Бразілія
	Арабская Рэспубліка Егіпет
	Рэспубліка Індыя
	Рэспубліка Куба
	Рэспубліка Перу
	ЗША
	Каралеўства Тайланд
	Туніская Рэспубліка
	Венгерская Рэспубліка
	Уругвай
27 снежня	Алжырская Народная Дэмакратычная Рэспубліка
	Сацыялістычная Рэспубліка В'етнам
	Кітайская Народная Рэспубліка
	Рэспубліка Польшча
	Рэспубліка Славенія
	Рэспубліка С'ера-Леонэ
	Італьянская Рэспубліка
28 снежня	Рэспубліка Афганістан
	Хашымійскае Каралеўства Іарданіі
	Султанат Аман
	Рэспубліка Інданезія
	Японія
	Сірыйская Арабская Рэспубліка
30 снежня	Народная Рэспубліка Бангладэш
	Рэспубліка Ліван
	Рэспубліка Карэя
	ПАР
31 снежня	Каралеўства Бельгія
	Каралеўства Данія
	Каралеўства Нідэрланды
	Каралеўства Марока
	Злучанае Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі
	Федэратыўная Рэспубліка Германія
	Ісламская Рэспубліка Пакістан
	Ірландыя
1992 год	
1 студзеня	Іракская Рэспубліка
2 студзеня	Лаоская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка
	Каралеўства Непал
	Рэспубліка Сінгапур
	Эфіопія
	Рэспубліка Эквадор
3 студзеня	Сацыялістычная Народная Лівійская Арабская Джамахірыя
	Французская Рэспубліка
4 студзеня	Рэспубліка Албанія
6 студзеня	Ямайка
	Рэспубліка Бурундзі
7 студзеня	Партугальская Рэспубліка
	Фінляндская Рэспубліка
9 студзеня	Рэспубліка Гвінея
	Аўстрыйская Рэспубліка
11 студзеня	Рэспубліка Венесуэла
14 студзеня	Мексіканскія Злучаныя Штаты
16 студзеня	Рэспубліка Каба-Вэрдзе
17 студзеня	Рэспубліка Экватарыяльная Гвінея
19 студзеня	Рэспубліка Ісландыя
22 студзеня	Рэспубліка Філіпіны
24 студзеня	Малі.

БЕЛАРУСЬ ЗА МЕЖАМІ БЕЛАРУСІ

"Ці існуюць беларускія выдавецтвы і рэдакцыі па-за межамі самой Беларусі?

Н.Гліцэвіч, г.Наваполацк".

Натуральна, існуюць. І пра іх ды іхнія выданні ўжо нямала чутно ў нас. Найбольш буйным прадпрыемствам такога роду з'яўляецца выдавецтва Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Беластоку (Польшча). Адно з ягоных выданняў — штотыднёвік "Ніва" ад пэўнага часу свабодна прадаецца ды распаўсюджваецца па падпісцы ў Беларусі. Выдаецца ў Беластоку і нямала беларускіх кніг, часопісаў, грампласцінак. Кнігі В.Петручука, Я.Чыквіна, С.Яновіча, А.Барскага перавыдаваліся нават у Менску.

На другім месцы, бадай, Нью-Йорк, дзе базуюцца выдавецтва Беларускага інстытута навукі і мастацтва і рэдакцыя газеты "Беларус". На іхнім рахунку шэраг навукова-папулярных, навуковых і мастацкіх кніг. Дзейнічаюць там і выдавецкі фонд П.Крычэўскага і Беларускі дабрачынны адукацыйны фонд.

Актыўна працуе і таронцкае выдавецтва "Пагоня" (Канада), якое выдала нямала тамоў беларускай паэзіі і прозы, рэлігійнай літаратуры, грампласцінак. Выдаюцца там таксама беларускі вайсковы часопіс "Зважай" і газета "Беларускі голас".

У Лондане ёсць выдавецтва Задзіночання беларусаў Вялікай Брытаніі, дзе выходзяць рэлігійныя кнігі, моваз-наўчыя, мастацкія, часопісы "Веснік беларускага каталіцкага душпастырства" і "Голас часу".

Прыкметную дзейнасць пакінулі па сабе выдавецтвы "Бацькаўшчына" (Мюнхен), "Зніч" (Рым) і г.д. Увогуле гэтая тэма вартая саліднага артыкула.

НОВЫЯ ПАДАРОЖЖЫ "УЛІСА"

"Люблю рок-музыку, але не люблю, калі рок-гурты пачынаюць "шлюбаразводныя" працэсы. Памятаю, калі пачала дзяліцца ды мяняць саставы "Бонда", дык так і прыйшла да знікнення. Ці не тое самае адбываецца цяпер з "Улісам"?

А.Пчэльнікаў, г.Івацэвічы".

Вы правільна прыкмецілі, што змены ў асабовым складзе гурта сведчаць і аб творчай нестабільнасці калектыву. Але прыклад з "Улісам" тут яўна не пасуе. "Уліс" якраз з'яўляецца адным з найбольш стабільных беларускіх рок-гуртоў. Гурт сабраўся дзеля творчасці, а не дзеля закалачвання грошай, таму мае больш трывалыя цэментуючыя стымулы. Змена вакаліста "Уліса" была выклікана сур'ёзнай прычынай — хваробай Андрэя Патрэя. Пасля шэрагу пробаў да "Уліса" далучыўся Алег Тамашоў, які раней спяваў у гуртах "Фарпост" і "Акцэнт". Разам з астатнімі музыкамі (В.Корань — гітара, С.Краўчанка — бас-гітара, С.Кныш — бубны) новы склад падрыхтаваў паўтарагадзінную праграму і гатовы да канцэртнай дзейнасці. Ёсць усе падставы меркаваць, што сённяшні і заўтрашні дзень будзе гэтак жа гучна трымаць у рок-свеце імя беларускага гурта "Уліс". Асабліва, калі не знікнуць на беларускай зямлі мецэнаты, не захірэюць спонсары. Бо фан-клуб "Уліс" існуе пакуль за мяжой: 02-736, Warszawa, ul.Mozarta, 3-614, Fan-club "Ulis".

ГЕТМАН-ПЕРАМОЖЦА

"Шаноўная рэдакцыя! Калісьці на старонках "Чырвонай змены" быў змешчаны артыкул, у якім расказвалася аб Аршанскай бітве. Беларускімі войскамі ў гэтай бітве кіраваў гетман К.Астрожскі. Раскажыце, калі ласка, пра яго падрабязней.

В.Міронаў, г.Кобрын".

Канстанцін Астрожскі (каля 1460—1530 гг.) паходзіў з роду заходнеўкраінскіх князёў. Ён вызначыўся ў барацьбе з крымскімі татарамі. Займаючы з 1497 года пасаду гетмана Вялікага княства Літоўскага, ён перамог больш чым у шасцідзесяці бітвах. У 1500 годзе ў бітве з войскамі Маскоўскага княства пацярпеў паражэнне. Сам Астрожскі (паранены) быў узяты ў палон. Яму прапанавалі выбар — або служба маскоўскаму князю, або

цямніца. Згадзіўся служыць, але ў 1507 збег на радзіму. У 1514 годзе ў бітве пад Оршай напалову разбіў маскоўскія войскі.

Актыўна абараняў праваслаўе. З'яўляўся фундатарам шэрагу цэркваў у Вільні, Беларусі, на Украіне.

З'яўляўся буйным землеўладальнікам. Частку зямель атрымаў у якасці пасагу жонкі (слуцкай князёўны Аляксандры). Большасць жа — як узнагароду за ратныя дасягненні.

Памёр у 1530 годзе ў Вільні. Пахаваны ў Кіеве ў Кіева-Пячорскай лаўры.

ШТО ТАКОЕ ПАРНАГРАФІЯ?

"Нядаўна ўрадам Рэспублікі Беларусь быў прыняты ўказ аб абмежаванні прапаганды парнаграфіі. Не маглі б вы даць больш-менш канкрэтны адказ, што такое парнаграфія і ў чым яе шкоднасць?

Галіна Церахава, г.Ашмяны".

У самім слове "парнаграфія" заключана негатыўная адзнака гэтай з'явы. Яно ўзнікла ад двух грэчаскіх слоў: "порнас" — брудны і "графас" — слова. Але адлюстроўванне палавога акта — не бруд, яно толькі паказвае тое, што робяць людзі. Само паняцце "парнаграфія" ўзнікла толькі каля 300 год назад.

Да гэтага часу кнігі і малюнкі на сексуальныя тэмы ўспрымаліся так, як і астатнія віды літаратуры і графікі. Амаль ва ўсім свеце погляд на іх не змяніўся і сёння.

У Кітаі, Японіі, Індыі, Афрыцы, на Бліжнім Усходзе і ў шматлікіх частках Еўропы паказ мужчын і жанчын, занятых сексам, не лічыцца непрыстойным.

У Японіі, напрыклад, усім маладажонам уручаюць багата ілюстраваную кнігу, дзе паказаны ўсе магчымыя варыянты сексу. Традыцыйна гэта кніга кладзецца пад падушку, каб гарантаваць чароўную шлюбную ноч.

Шэдэўр індыйскай архітэктуры — храм Сонца ў Канараку. Унутры яго сцены пакрытыя скульптурамі мужчын і жанчын у натуральную велічыню, якія паказваюць усе магчымыя спосабы палавога акта.

Некаторыя людзі, у тым ліку заканадаўцы, лічаць, што парнаграфія — гэта дрэнна. Але тым самым яны спрыяюць гандлярам парнаграфіяй. Нядаўна ў Даніі былі зняты ўсе перашкоды на паказ сексуальных сцэн. У выніку продаж парнаграфіі зменшыўся на 40 працэнтаў. Напэўна, забарона стварала ёй дадатковую прыцягальнасць.

Цяжка сказаць, у чым шкоднасць парнаграфіі. Яна проста прадстаўляе людзей такімі, як яны ўстроены, уключаючы іх палавыя органы. Яшчэ ні аднаго разу не было даказана, што хто-небудзь учыніў пад уплывам парнаграфіі палавое злачынства. Зрэдку парнаграфію знаходзяць у пакоі, дзе з асаблівай жорсткасцю было здзейснена забойства на сексуальнай глебе. Але там могуць знаходзіцца і слоўнік, і тэлефонны даведнік, і наогул, Біблія. Шматлікія псіхіятры, паліцэйскія, пракуроры лічаць парнаграфію патрэбным і карысным клапанам бяспекі, які знімае сексуальнае напружанне ў патэнцыяльных злачынцаў і перасцерагае ад утварэння іх сексуальных фантазій на практыцы.

Дзецям парнаграфія не карысна, але і не вельмі шкодна. Калі ўсё іх веданне сексу — вынік вялікіх грошай, аддадзеных гандлярам парнаграфіяй, гэта можа пашкодзіць ім у жыцці. Калі ж яны добра дасведчаны ў сексе, парнаграфія не зробіць ім шкоды.

Падрыхтавана па кнізе Дэвіда Рэйбена "Усё, што вы хочаце ведаць пра секс, але саромеецеся спытаць".

ВУЧЫЦЦА, ВУЧЫЦЦА І... ВУЧЫЦЦА СЕКСУ

"Чуў, што ў Беларусі ствараецца нейкае таварыства па сексуальнай культуры грамадства. Ці так гэта?

Алесь С., г.Мінск.".

Сапраўды, ініцыятыўная група сексолагаў, юрыстаў, венеролагаў, мастацтвазнаўцаў і інш. вырашыла стварыць Беларускую Асацыяцыю сексуальнай культуры (БАСК). Наш карэспандэнт сустрэўся з адным з членаў ініцыятыўнай групы, вядомым сексолагам Беларусі Дзмітрыем Зіноўевічам Капусціным і вось што ад яго даведаўся па гэтаму пытанню.

БАСК аб'ядноае спецыялістаў, актыўных удзельнікаў арганізацый і рухаў, чыя дзейнасць накіравана на павышэнне культурнага ўзроўню (у тым ліку сексуальнага) насельніцтва Рэспублікі Беларусь, развіццё сучаснай сексалогіі і яе прававых асноў, удасканаленне палавога выхавання грамадзян. Дзейнасць БАСК будзе ўключаць у сябе аказанне сексалагічнай дапамогі, вывучэнне стану палавой культуры і паводзін людзей, садзейнічанне выкананню ўрадавых праграм, накіраваных на ўмацаванне сямейна-шлюбных адносін, фарміраванне сацыяльна прымальных форм палавых паводзін у моладзі, прафілактыку прававых правапарушэнняў.

— Мы маем намер аб'яднаць пад дахам БАСК прадстаўнікоў усіх сексуальных напрамкаў: гетэрасексуалаў і сексуальных меншасцей. Гэта дасць магчымасць вырашаць іх агульныя праблемы, знаходзіць кампрамісы і спосабы мірнага ўзаемаіснавання і знаходзіць правільныя шляхі для правядзення адзінай асноўнай праграмы выхавання палавой культуры людзей.

Адказы рыхтавалі: М.Багадзяж, А.Краўчанка, В.Мартыненка, А.Палынскі.

Лапцевая пошта

Пра тое, як я сам у сябе хату купляў

ЛІСТ ДРУГІ

Дабрадзень, шаноўныя рэдактары!

Найпярвей хачу вам аддзячыць добрым словам за тое, што караваю маёю пісанінаю не пагрэбавалі, а наштампавалі яе ў газеце ў вельмі культурным выглядзе. Дай вам Бог вялікага тыражу на многія лета.

Цяпер жа распавяду пра сваё гора пакутнае, і няхай яно запаліць у добрых вашых душах іскрынку спагады ды пральецца гаруча-змазачнай слязінай спачування.

Колькі месяцаў, як сканаў мой дарагі і адзіны кот Беламор Каналавіч, як застаўся я больш адзінокі, чым мокрая ануча, жыць у роднай хатцы, нібы ў прымах. А чаму ў прымах — таксама вам абтлумачу. Толькі ж, не спяшаючы раней бацькі ў пекла, буду пра ўсё распавядаць па парадку.

Сканаў, значыцца, мой кармілец дарагі дачасна і нечакана, нат не паспеўшы яўкнуць пра тое, як мне далей жыць ды горачка гараваць. Вось тут і сербануў я таго горачка нагбом ды на поўную катушку.

Адзін паратунак — не давялося мне нябожчыку новага адзення купляць, бо спрытную шубу з натуральнага футра мой каток надыбаў сабе даўно, яшчэ калі ўсё сацыялізм развівалі ды ўдасканальвалі. І надыбаў не якую-небудзь шырспажывецкую, бо зносу ёй не было — вячніна.

Кінуўся я ў роспачы труну шукаць, у раён кінуўся. А там на мяне як на марсіяніна пазіраюць і надзівіцца не могуць:

— З якога ты, чалавеча, стагоддзя?— пытаюцца.

Аказваецца, на раён зараз выдзяляюць усяго адну труну, дый тую ўстанаўліваюць для доступу ў мясцовым краязнаўчым музеі, каб, значыцца, людцы хадзілі на экскурсіі ды глядзелі, ды не забываліся, як дамавіна выглядае. А службы пахавальныя — хто іх ведае, чым цяпер займаюцца? Мо асвойваюць серыйны выпуск японскіх прысервацываў — спецыяльна для нябожчыкаў, а мо заняліся зборам інфармацыі пра зомбі? Дзякаваць Богу, было ў суседа тры дошкі, а на калгаснай пілараме тры хлопцы-малойцы, дык не застаўся мой дарагі каток пад плотам на атамы раскладацца.

Ды адна бяда не ходзіць. Успомніў я, дарагія рэдактары, мудрыя словы: галасі, а гарэлку насі. Успомніў пра памінкі і паехаў па гарэлку. Праўда, кабета за прылаўкам расчулілася, добрая душа, мэнтам адпусціла мне паложаных дзве скрыні беленькай ды адну чырвоненькай. А як стаў расплачвацца, тады сам напачатку чырвоненькім зрабіўся, апасля беленькім. Карацей, расплачваўся я расплачваўся, дый расплакаўся. Бо не так за катка, як за дзяржаву балюча стала. Хаця ж бо яна на маім горачку свае фінансавыя бязглузды паправіла, хаця пабагацела б. А ці ж я вечарынку ўдумаў ладзіць, што мяне сярод бела дня родненькая дзяржава нагала распранула?

Няма чаго й казаць, што па сервеблат, які так любіў мой каток, я ўжо й ня ехаў. Бо не да жыру — быць бы жыву.

Ну, ды хутка казка кажацца, ня хутка стол жалобны робіцца. Аплакаў я свайго каточка, людзі прыхінуліся. І ўсё як у людзей было.

Пайшоў назаўтра ж у сельсавет пасведчанне аб смерці выпісваць. А там цёткі такія спагадлівыя ды разумныя — глыбока да сэрца маю жалобу прынялі. І будуць яны мне казаць:

— Маліся, чалавеча, Богу, што вы з Беламорам Каналавічам на дзень яго смерці сумесна пражывалі і агульную гаспадарку вялі. А то адсцягнуў бы ты за сваю хатку грошыкі і немалыя.

Мяне, ці паверыце, як абухом хто па цемечку ўдарыў. Думаў, грэшная справа, няйначай зараз другія хаўтуры будуць людзі ладзіць.

А цёткі і далей мяне, цёмнага, адукуюць, раскрыўшы гаспадарчую кнігу.

— Ага, Беламор Каналавіч у вас галавой сям'і быў. А гаспадарка ваша служачая.

— Нягож,— ківаю галавой,— каторы гадок нам служыць верай і праўдай.

— Ды не,— пасміхаюцца,— проста калі б ваша падвор'е калгасным было, то яно зараз аўтаматычна да цябе перайшло б, а як служачае — толькі праз натварывус.

А мой Каналавіч да пенсіі нейкім дробным чыноўнікам служыў у прам-мышпроме.

Узяў я даведку патрэбную, пайшоў да таго натварывуса. А той мне й будзе казаць:

— Табе, даражэнькі, найпярвей трэба шыбаваць у бюро тэхнічнай інвен...венцілізацыі, каб да сваёй хаткі прыцаніцца.

— Як гэта прыцаніцца?— не веру. Ды ёй цаны няма, родненькі.

А сам сабе й думаю: ці то я ад горачка з глузду з'ехаў, што во хату сам у сябе купляю, а ці ў дзяржавы не ўсё ў парадку з галавою?

А натварывус мне тлумачыць:

— Пашпарт такі выпішуць тваёй хатцы, як во ў магазіне цэннік навешваюць, пасведчанне...

А! Дайшло! Значыцца, і хатцы маёй зараз пасведчанне аб смерці выпісваць будуць.

Паклыпаў я ў тую венцілізацыю і давай пашпарт прасіць.

— Што ты, чалавеча,— спачуваюць,— мы перабудаваліся ўжо. За пашпарт цяпер семдзесят рублёў бяром. Ідзі-шка ты ў зверbanк, аплаці чэк, тады й прыходзь. Выдадзім табе хоць сем пашпартоў.

Вось дык венцілізацыя!.. Лэп я за кішэню — а яна пустая. Добра, успомніў, што мне каток яшчэ пры жыцці капейчыну завяшчаў. Капейчына тая — кот наплакаў, на смертачку ўсё збіраў. Але на бязрыб'і — і рак рыба. Весялейшы, чашу я з тае рэкетызацы ў зверbанк. Паглядзелі там на мяне, паспачувалі і давай

струкцыі чытаць. Чыталі-чыталі — вычыталі.

— Трохі табе, чалавеча, — кажуць,— грошай дамо, але не ўсе, бо ёсць такі спецратунак, на які простае смяротнае завяшчанне не дзейнічае.

А гэта, аказваецца, той самы спецратунак, на які можа помніце, летась Паўлаў, калі ў красавіку абманны дзень наладзіў, дык сорак працэнтаў нашых грошыкаў перакінуў. Перакінуць перакінуў, а ў струкцыі не было калі яму дужа ўдавацца. Самі ведаеце — справы ў яго былі вельмі важныя, дзяржаўныя. Ды неўзабаве зімачка прыйшла, вось і замарозіўся той ратунак. Няведама, калі яшчэ растане...

Ці вы там ня чулі, даражэнькія рэдактары? Тут людзі баюць, нібыта цяпер аж да самога Паўлава трэба ісці, каб асабіста напісаў завяшчанне — тады і грошы выдадуць?

А ці ж нас, смяротных, пусціць хто ў тую іхнюю цішыню матроскую? Тут, калі і трапіш, крый Божа, з пахмелля ў каталажку, там табе такую "цішыню" наладзяць — доўга сам сябе чуць не будзеш. Ну што ж, Богу Богава, а Паўлаву Паўлава.

Ці паверыце, родненькія, як пахаваў я свайго дарагога каточка ды як нахадзіўся, нібы Марка па пеклу, дык самому надоўга паміраць расхацелася. Божа барані цяпер паміраць! У горадзе вунь метал скончыўся і абгароджы на могілкі не робяць. Будзеш ляжаць, як дурань, сярод поля. І хто той метал паеў? Хіба палякі? А на помнікі чаргу ўстанавілі аж но да чацвёртага тысячагоддзя альбо да другога Прышэсця. Вось як спусціцца на зямлю Гасподзь праведны, як павылазяць нябожчыкі на страшны суд з магілак, тады і месцы вакантныя паявяцца, тады і помнікаў будзе, хоць гаць гаці. А што, калі да таго часу, у сувязі з рынкам, на нябожчыка падатак прыдумаюць: за развітанне — пачасовая, за яму ў сасонніку — ад метражу, за слёзы — ліміт на кожнае вока, а тое, што звыш ліміту — па прагрэсіўнай шкале.

А вы там усё пішаце, традыцыі аднаўляць, абрады. Ды мы б рады тыя абрады, каб толькі не гэтыя абірады...

Не, браточкі, вы сабе як хочаце, а я паміраць не збіраюся і вам не раю.

Ваш Міхась ВАЛОХА
з-пад Лепля.



Эталон дзяржаўнага сцяга з навершнікам.

ПАКУТЫ «ПАГОНІ»

Вяртанне старажытных сімвалаў беларускага народа

Цікава, вельмі цікава жыць на пераломе гістарычных эпох. Калі ў 1978 годзе я разам са сваім сябрам, архітэктарам Сяргеем Багласавым змясцілі старадаўнюю "Пагоню" над эскізам аднаўлення і рэстаўрацыі Лідскага замка, ніхто з нас не мог нават падумаць, што праз нейкіх няпоўных 15 год яна стане візітнай карткай незалежнай Беларусі. Больш таго, мы былі вельмі засмучаныя, калі пад час друкавання нашага праекта адбудовы Лідскага замка ў архітэктурным часопісе, што выходзіць у Каўнасе, літоўская цэнзура зрэзала выяву "Пагоні" з усіх нашых фотаздымкаў.

А колькі намаганняў трэба было прыкласці, каб увесну 1991 года неўміручы вершнік, што заўсёды бараніў сваю Бацькаўшчыну, з'явіўся на бліскучым ветраніку (флюгеры), што аздобіў стромкі дах першай аднаўленай вежы замка XIУ ст. у Лідзе.

Зараз, пасля таго, як нашы старадаўнія герб і сцяг прызналі больш чым 70 краін свету, нельга не сказаць словы падзякі тым мастакам і навукоўцам, што маюць непасрэднае дачыненне да вяртання беларускаму народу яго некалі занядбаных святынь. Паколькі вялізная праца над распрацоўкай эталонаў герба, сцяга і пячатак Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ужо практычна закончана, хацелася б расказаць чытачам "Чырвонай змены", якія пільна і часам даволі крытычна сачылі за гэтай работай, аб асноўных яе ўдзельніках.

Апошнія дзесяцігоддзі наш старажытны герб "Пагоня" і бел-чырвона-белы сцяг цяжка і пакутліва прабіваліся на свет Божы праз завалы невуцтва і нацыянальнага нігілізму. Партапаратчыкі пільна сачылі, каб ні ў літаратуры, ні ў мастацкіх творах, ні ў гістарычных даследаваннях і згадкі не было пра гэтыя спрадвечныя нацыянальныя сімвалы беларусаў. І тым не менш, праўда перамагла. Пытанне аб нацыянальнай сімволіцы, аб сцягу і гербе Рэспублікі Беларусь было ўнесена ў парадак дня верасеньскай сесіі Вярхоўнага Савета. Напярэдадні гэтай сесіі па ініцыятыве парламенцкай апазіцыі на платформе БНФ з мэтай азнаямлення з гэтай тэматыкай народных дэпутатаў Беларусі ў фае перад парламенцкай залай Вярхоўнага Савета была разгорнута спецыяльная музейная выстава пад назвай "Герб і Сцяг". За стварэнне выставы ўзяліся мастакі Яўген Кулік, Уладзімір Крукоўскі, Мікола Купава і Аляксей Марачкін. У працэсе работы да іх актыўна далучыліся Лявон Бартлаў, Леў Талбузін, Тодар Ладуцька, Ігар Марачкін і Вячаслаў Дубінка. У кароткі тэрмін была выпрацавана канцэпцыя выставы (аўтар Я.Кулік), сабрана некалькі сотняў экспанатаў як гістарычнага, так і сучаснага айчыннага і замежнага паходжання. Выстава зрабіла значнае ўражанне на многіх дэпутатаў, станоўча паўплывала на выніку галасавання. 19 верасня 1991 года "Пагоня" і бел-чырвона-белы сцяг былі зацверджаны ўжо ў якасці дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь. Неўзабаве пасля гэтага, 4 кастрычніка 1991 года, Прэзідыум Вярхоўнага Савета стварыў Камісію па выпрацоўцы эталонаў дзяржаўнай сімволікі і атрыбутыкі (г.зн. герба, сцяга, пячатак, нагруднага знака і г.д.), а таксама нарматыўных дакументаў да іх. Узначаліць камісію было даручана мне. Камісія склалася з вядомых беларускіх гісторыкаў, мастацтвазнаўцаў, мастакоў, дызайнераў, народных дэпутатаў Беларусі. Сярод навукоўцаў варта адзначыць дактароў гістарычных навук Анатоля Грыцкевіча і Георгія Штыхава, кандыдата гістарычных навук Валянціна Голубева (намесніка старшыні камісіі), кандыдатаў мастацтвазнаўства Тамару Габрусь і Зянона Пазняка, кандыдата юрыдычных навук Марыну Сатоліну, а таксама выдатнага знаўцу беларускай геральдыкі Анатоля Цітова і старшыню Камісіі па культуры і захаванню гістарычнай спадчыны Мінскага гарсавета Ігара Чарняўскага. Адначасова над эскізамі пачала працаваць група мастакоў (Л.Бартлаў, У.Крукоўскі, Я. Кулік, М.Купава, Л.Талбузін), якую курыраваў член камісіі, народны дэпутат Зянон Пазняк, мастацтвазнаўца і гісторык. Так склалася, што над эталонам герба ў асноўным працавалі Яўген Кулік і Уладзімір Крукоўскі. Эталон сцяга з навершам распрацаваў Мікола Купава. У працэсе працы каштоўныя парады і кансультацыі аўтары атрымалі ад вядомых беларускіх графікаў Арлена Кашкурэвіча і Уладзіміра Лукашыка, а таксама члена нашай камісіі, архітэктара, народнага дэпутата Лявона Зданевіча. Камісія шчыра дзякуе ім, а таксама ўсім, хто застаўся неабыякавым да нашай працы, выказваў як станоўчыя, так і адмоўныя заўвагі, асабліва, калі яны нясуць канструктыўны характар. Былі, вядома, і такія лісты, у якіх аўтары сцвярджалі, што "Пагоня" — гэта літоўскі герб, а бел-чырвона-белы сцяг прыдумалі фашысты. Такім "змагарам за справядлівасць" быў дадзены адказ 17 студзеня 1992 г. на старонках "ЛіМа" і "Навін Беларускай акадэміі".

Была і іншая крытыка, у якой аўтары падвяргалі сумненню асобныя дэталі эталона Дзяржаўнага герба. Шмат заўваг было выказана па форме крыжа на шчыце вершніка. Частка чытачоў "ЛіМа" і "Чырвонай змены" чамусьці аднесла самую старажытную выяву хрысціянскага крыжа на Беларусі (давайце ўспомнім крыж Еўфрасінні Полацкай!) толькі да праваслаўнай сімволікі, забываючы пры гэтым, што выява патрыяршага крыжа была вядома задоўга да падзелу хрысціянства на каталікоў і праваслаўных, і таму невыпадкова шануецца славакамі, якія належаць да каталіцкай канфесіі.

Студэнт гістфака БДУ Уладзімір Вяроўкін нават сцвярджае, што яму невядома ніводнай выявы "Пагоні" з патрыяршым крыжам. Я б параіў бы яму ўважліва прачытаць артыкул Г.Штыхава і Г.Галенчанкі "Пагоня" ("Сімволіка старажытнага герба", гл. "Навіны Беларускай акадэміі", 11 кастрычніка 1991 г.). Там, дарэчы, змешчана самая старажытная выява "Пагоні" на надмагіллі Ягайлы, якая і ўзята намі за праобраз сучаснага эталона герба. Вельмі пужае спадара Вяроўкіна і памер шпораў даўжынёй да 40 см. Каб не было так страшна, прапаную яму зірнуць на шпору, што знойдзена мною пад час раскопак у Лідскім замку.



Лідскі замак. Шпора XVI—XVII ст. ст.

Менавіта такая шпора намалявана на нашым гербе. Дарэчы, такую ж даўжыню, аднак з іншым колцам, маюць шпоры вершніка на гербе Літвы.

Шмат каму не падабаецца і выява каня. Як не згадаць тут думку В.Занежанкава (гл."Чырвоную змену" 27.01.—2.02.1992), які піша, што "нехлямяжыя беларусы пасадзілі рыцара на калгаснага лашака і кажуць, што гэта наш герб..." Самае цікавае, што нашы "калгасныя лашакі", якія так не падабаюцца некаторым гараджанам, вядуць радавод менавіта ад рыцарскіх коней, ад тых "грозных коней", пра якіх пісаў Максім Багдановіч. Так, мастакі на нашым гербе намалявалі бургуна—фламандскі тып каня, уласцівы для еўрапейскага рыцарства XIV— першай паловы XVI ст.ст. Дарэчы, менавіта такі конскі тып адлюстраваны на гербе БНР у 1918 годзе.

Пасля таго, як у Еўропе пашырылася агнястрэльная зброя, рыцары і шляхта пераселі на лёгкіх коней, якія маюць іспанскі радавод, а сваіх баявых сяброў аддалі сялянам. Таму сучасныя конскія пароды першэроны і брабансоны, якія, на шчасце, захаваліся ў нашых вяскоўцаў, нягледзячы на хрушчоўскую экспрапрыяцыю, паходзяць ад тых баявых коней, на якіх баранілі Беларусь Давід Гародзенскі і Канстанцін Астрожскі.

Найбольш слушная заўвага была выказана на старонках "ЛіМа" спадаром Копцікам ("ЛіМ", 31 студзеня 1992 г.), які прапануе ў адпаведнасці з законамі геральдыкі зрабіць шчыт у вершніка чырвонага колеру. Так, большасць вядомых нам гербаў пабудаваны менавіта па такому прынцыпу, аднак ёсць і выключэнні. І мы мусілі пайсці на яго, бо чырвоны шчыт на чырвоным фоне развальвае каляровую еднасць герба. Гэта адчувалі і нашы продкі, якія, пачынаючы з XVI ст., часам змяшчалі залаты крыж на шчыце сіняга колеру. Па гэтаму шляху пайшлі і нашы літоўскія суседзі, якія 4 верасня 1991г. змянілі эталон свайго Дзяржаўнага герба: чырвоны фон шчыта замянілі на сіні. Мы зыходзілі з таго, што ў старажытным апісанні "Пагоні" выкарыстоўваліся толькі два колеры: белы (конь) і чырвоны (вершнік на такім фоне). Пра колер шчыта ў старажытных хроніках нічога не сказана, а тым больш няма ні слова пра сіні фон для шчыта. Таму, каб захаваць гістарычную праўду і захаваць каляровую еднасць герба, было вырашана змясціць выяву залатога шасціканцовага крыжа на срэбным (белым) шчыце.

У канцы свайго допіса патрэбна звярнуцца да Задзіночання беларускіх студэнтаў і маладзёжнай арганізацыі "Выбранецкія шыхты", якія прапануюць наладзіць конкурс на лепшую выяву "Пагоні". Шаноўныя спадары! Зусім нялёгка праходзіла ў нашым Вярхоўным Савеце пытанне аб тым, каб нацыянальную сімволіку зрабіць дзяржаўнай. Успомніце, колькі самых недарэчных праектаў герба прапанавалі ў верасні мінулага года чытачы адной толькі "Звязды". Каб мы наладзілі конкурс ды вынеслі на Вярхоўны Савет некалькі розных варыянтаў, то, напэўна, апынуліся ў той незайздроснай сітуацыі, якая ўласціва зараз для Расіі, што пакуль не мае гістарычнага герба і карыстаецца савецкай сімволікай на сённяшні дзень. Кожны дзень існавання без дзяржаўнага эталона герба прыносіць і значныя фінансавыя страты, бо без выявы герба дзяржава існаваць не можа, а замена старых пячатак, бланкаў, шыльдаў і г.д. абыходзіцца ў значную капейку. Таму раю вам выкарыстаць сваю маладую энергію на канкрэтныя справы, накіраваныя на адраджэнне нашай Бацькаўшчыны.

А.А.Трусаў,
намеснік старшыні Камісіі
Вярхоўнага Савета Беларусі
па адукацыі, культуры і захаванню
гістарычнай спадчыны,
кандыдат гістарычных навук.

БЕЛАРУСКІ КА

1/17 (лютага па ст.ст.) Н. **Ціран,** заступнік ад злодзеяў.

2/18 (лютага па ст.ст.) Пн. ***Масленіца, Масленка** –пачатак Масленічнага, Сырнага тыдня — восьмы тыдзень перад Вялікаднем. У некаторых раёнах цэлы тыдзень "гукаюць вясну".

4/20. С. ***Папелец**[1], пачатак Вялікага посту ў каталікоў. **Казімір** ("Сьвяты Казімір дровы сякець і ў клад кладзець";"Казімера — дзень і ноч умера").

5/21. Ч.***Крывы чацвер, Валосы, Улас** – свята жывёлы, культу язычніцкага Воласа, чацвер на Масленічным тыдні.

8/24. Н.***Масленічныя загавіны,** апошні дзень Масленіцы. ***Гуканне вясны.**

9/25. Пн.***Шыльны панядзелак, Паласказуб** – першы дзень Вялікага посту (7 тыдняў да Вялікадня).**Абертас, Паўраценне** – паварот птушак дадому.

10/26. А. **Сорак мучанікаў, Прыска, Пліска,** свята сустрэчы птушак ("На Прыска праб'е лёд і пліска").

11/27. С. ***Уступная серада,** першая серада Вялікага посту.

12/28. Ч. **Рыгор** ("На святога Рыгора ідуць рэкі ў мора").**Васіль і Марына,** дзень абмежаванняў на прадзенне.

13/29. Пт. **Касьян.** Адзначалі толькі адзін раз у чатыры гады за тое, што ён, згодна з легендай, падпаліў Івану Хрысціцелю вусы.**Аўдоцця Вясноўка,** першы дзень вясны і жанчыны. Гуканне вясны.

14/1(сакавіка па ст. ст.) ***Зборная субота,** субота перад Зборам. Абрад "споведзі дзежкі".

15/2. Н.***Збор, Ізбор,** пачатак збору селяніна ў поле; нядзеля першага тыдня пасля Масленіцы.

17/4. А. **Герасім Грачэўнік,** дзень прылёту гракоў.

18/5. С. **Конагароднік,** дзень падрыхтоўкі да пасадкі расады капусты.

19/6.Ч. **Язэп** ("Язэп кіўне барадою, дык зіма ўцякае ўніз галавою"; "Сьвяты Язэп сярод посту шлюб дае прахвосту").

20/7. Пт. Астранамічны дзень вясенняга раўнадзенства.

22/9. Н. **Саракі** ("На Саракі прылятае сорак выраяў"), дзень сустрэчы птушак. **Пліска, Прыска.**

25/12. С. **Дабравешчанне, Звеставанне** ("У каго хлеба шмат — і Дабравешчанню рад").**Рыгор** ("На Рыгора зіма ідзе ў мора").

25/13. Ч. **Міжблагавешчыны** (да 7.04). Забарона на запасванне кароў.

30/17. Пн.Пачатак ***Крашчатага, Благавеснага тыдня,** чацвёрты тыдзень Вялікага посту. Пяклі "храсты" (пячэнне).**Аляксей Цёплы** ("На Цёплага Аляксея рыба ідзе на нераст, карова на верас, а бартнік на хвою").

---

* Зорачкай абазначаны каляндарныя дні, якія не маюць пастаяннага месца, а залежаць ад Вялікадня.

[1] Гэтак выдзелены святы і прысвяткі беларусаў-каталікоў.

Алесь Лозка.

Малюнак Алены Шлегель-Лавецкай.

З ГІСТОРЫІ КАЛЕНДАРА

Слова "каляндар" паходзіць ад старажытнарымскага "календы" ("calendae"), што азначала: першыя числы кожнага месяца (дні маладзіка). Найменне адпавядае і слову "каляндарыум" — кніга, куды запісваліся даўгі, працэнты, па якіх патрэбна было плаціць, і маладзіковыя дні.

Месяцавыя ("лунные") меры часу — найстаражытнейшыя. Лік часу толькі па звароту Месяца, што існаваў у першабытным грамадстве, называўся месяцавым календаром. Дагэтуль захавалася ў побыце сялян завядзёнка — пачатак розных работ суадносіць з пэўнымі квадрамі Месяца: маладзік, веташок, падпоўня, поўня, зыход і г.д. Развіццё земляробства, жывёлагадоўлі прывяло першабытнага чалавека да карыстання і большымі храналагічнымі мерамі: сезонамі, гадамі. Так з'явіліся ў старажытным свеце сонечны і сонечна-месяцавы календары. Апошні ўжо змяшчаў некалькі месяцавых пораў (прыблізна 12,4). Праз шэраг гадоў дадавалі цэлую месяцавую пару, каб прыблізіць месяцавы год да сонечнага.

Чалавецтва на працягу свайго існавання ўдасканальвала меры часу, каб каляндар лепш адпавядаў астранамічнаму году. У 46 годзе да н.э. у Старажытным Рыме, дзе дзейнічаў складаны і нязручны сонечна-месяцавы каляндар, праслаўлены палкаводзец і ўладар Юлій Цэзар ажыццявіў рэформу ў летазлічэнні. Згодна з нававядзеннем, Новы год пачалі святкаваць з 1 студзеня, а працяглаcць года стала раўняцца 365,25 сутак. Эра вызначалася "ад стварэння свету" — у 5508 годзе да н.э. Так, напрыклад, 1993 год неабходна лічыць 7501 годам "ад стварэння свету" (5508 + 1993).

У VIII стагоддзі была прынята новая эра — ад нараджэння Ісуса Хрыста, 7 студзеня (25 снежня па старому стылю) нулявога года. Гэтую дату ўстанавіў, зрабіўшы складаныя разлікі, рымскі манах, папскі архіварыус Дзіянісій у VI стагоддзі.

Юліянскі каляндар адставаў ад астранамічнага года. За 128 гадоў набіраліся цэлыя суткі. Таму ў 1582 годзе рымскі папа Грыгорый XII, беручы за аснову праект італьянскага ўрача, матэматыка і астранома Алаізія Ліліё, правёў рэформу: 4 кастрычніка быў аб'яўлены 15-м і ўпарадкаваны высакосныя гады. Грыгарыянскі каляндар стаў больш дакладным і разыходзіўся ў адны суткі з астранамічным часам не за 128 гадоў, а за 3323.

Цяпер усе краіны ў міжнародных адносінах карыстаюцца агульнапрынятым сонечным грыгарыянскім календаром. Аднак ва ўнутраным і рэлігійным жыцці некаторыя выкарыстоўваюць месяцавыя і сонечна-месяцавыя. Так, у Паўднёва-Усходняй Азіі яшчэ папулярны старажытны цыклічны каляндар, які першапачаткова ўзнік у Кітаі. Ён сонечна-месяцавы і вядзе летазлічэнне не стагоддзямі, а цыкламі па 60 гадоў. Кожны цыкл складаецца з шасці 10-гадовых і адначасова пяці 12-гадовых перыядаў. Цікавыя народныя традыцыі цыклічнага календара захаваліся ў Кітаі, Японіі, В'етнаме, Бірме. Месяцавыя календары зберагліся ў мусульманскіх краінах. Сярод сонечных вядомы старажытнаегіпецкі, кумранскі, індзейцаў племя майя і іншыя.

Які каляндар існаваў у беларусаў? Як сведчаць археалагічныя знаходкі, усходнія славяне мелі рэчыўныя календары — на іх язычнікі ўмоўнымі знакамі абазначалі дні свят і ігрышчаў, земляробчых работ. Акадэмік Б.А.Рыбакоў налічвае каля дзесятка сасудаў II—IV стагоддзяў, па якіх раней "чтаахy" (лічылі) і "гатааху" (гадалі). Спецыяльнага даследавання на матэрыяле беларускіх знаходак пакуль не вядома. Акрамя гэтага, усходнеславянскія народы карысталіся драўлянымі брускамі даўжынёй 30—50 сантыметраў з трыма, чатырма ці шасцю гранямі, дзе рабіліся спецыяльныя ўмоўныя нарэзы. Да нас дайшлі народныя разныя календары, выробленыя паміж XII і XVIII стагоддзямі.

Яшчэ і цяпер у некаторых пажылых людзей захаваліся календары ў сшытках, дзе запісаны для памяці святы і прысвяткі — каляндарныя дні, што не святкуюцца, а толькі адзначаюцца.

Кожны дзень тыдня асэнсоўваўся таксама адносна мэтазгоднасці пачынаць тую ці іншую сельскагаспадарчую або сямейную справу. Існавалі яшчэ жаночыя і мужчынскія, посныя і скаромныя дні. Панядзелак — няўдачлівы, нешчаслівы, цяжкі. Не трэба пачынаць нічога важнага, напрыклад, сеяць, жаць, будаваць, выбірацца ў дарогу, выганяць першы раз кароў на пашу, снаваць кросны. Гэта мужчынскі дзень, "моцны". Таму ў некаторых раёнах садзяць агуркі, гарбузы, фасолю, каб былі моцнымі. У панядзелак не падкладваюць яйкі пад курыцу, каб не выводзіліся пеўнікі. Квасяць капусту. Аўторак — мужчынскі, удачлівы дзень. Пачынаюць усякую работу. Серада — няцотны, жаночы, посны дзень. Садзяць агародніну, нарыхтоўваюць капусту. Добры дзень "на маладзіку" для закладкі печы, хаты. Чацвер — мужчынскі, спрыяльны для ўсіх работ, акрамя пасадкі агародніны, загатоўкі сала. Лічыцца "чарвівым" днём (па гукавой асацыяцыі: чацвер — чэрві). Пятніца — жаночы, няцотны, посны дзень. У розных раёнах успрымаецца па-свойму: як шчаслівы, так і нешчаслівы. Можна выконваць многія работы ў годзе, асабліва "запасваць тавар" (кароў), сеяць, будаваць, "насаджваць" курыцу і інш. Гукавая асацыяцыя "пятніца-п'яніца" дзесьці зрабіла дзень нешчаслівым. Існуюць забароны на ткацтва і прадзенне, звязаныя з персаніфікацыяй пятніцы ў вобразе святой Параскевы Пятніцы. Субота — жаночы, цотны, апошні дзень. Шмат забарон і абмежаванняў на работы і найбольш у сувязі з тым, што "свет асноўваўся ў суботу". Можна сеяць лён і каноплі. Нядзеля — жаночы дзень. Нельга выконваць гаспадарчыя палявыя работы, але не забараняюцца хатнія. Варта пачынаць некаторыя сімвалічныя: першы выган жывёлы, першае ворыва, першы дзень будоўлі хаты. Забараняецца мыць дзіця і бялізну. Лічыцца, напрыклад, што ў гэты дзень з'яўляюцца на свет цялушкі, а не бычкі.

Вусны народны каляндар уключае багаты вопыт назіранняў земляроба над навакольным асяроддзем. Сюды ўваходзіць як сістэма размяшчэння пэўных каляндарных дзён, так і прыказкі, прыкметы адносна надвор'я і будучага ўраджаю, а таксама абрады, гульні і песні. Аднак самая цікавая з'ява тут — валачобныя каляндарныя песні. Яны — характэрная адметнасць беларусаў і іншым славянам амаль невядомыя. У паэтычных тэкстах, якія выконваліся на Новы год, Вялікдзень, малюецца радаснае веснавое свята, абуджэнне зямлі, велічаюцца і віншуюцца гаспадар і яго сям'я, паэтызуецца праца.

…аляндар

Люты Бог

У апошні час на старонках перыядычнага друку даволі часта праводзяцца параўнанні Дзеда Мароза з Санта Клаусам. Але мала каму вядома, што гэта не тоесныя персанажы. Правобразам Санта Клауса з'яўляецца каталіцкі святы мучанік Клаус (Клаўдзій), а правобразам нашага Дзеда Мароза — старажытнаславянскі язычніцкі бог Зюзя.

Праўда, па свайму знешняму выгляду Зюзя быў не вельмі падобны да сучаснага любімца дзяцей. Лысы дзядок у даўгаполым (амаль да зямлі) мехавым адзенні, заўжды босы. Што праўда, то праўда — была ў яго, як і ў Дзеда Мароза, доўгая барада і посах, зроблены з сасны. Але посах гэты быў такіх памераў і таўшчыні, што выкарыстоўваўся час ад часу ў якасці дубіны. Менавіта такім уяўляюць там-сям на Брэстчыне гэтага бога. Характарам жа ён адрозніваўся ад свайго "нашчадка" яшчэ больш, чым адзеннем. Калі Дзед Мароз — сама дабрыня, то Зюзя хутчэй злы. Ён любіў ператварацца ў велічэзнага снежнага мядзведзя і нападаць на адзінокіх падарожных. Зюзя-мядзведзь не раздзіраў сваю ахвяру, а навальваўся на яе ўсім цяжарам сваёй халоднай тушы і трымаў, аж пакуль здабыча не замярзала.

Даволі часта зладзейнічаў Зюзя не адзін, а са зграяй пакорлівых яму завірух. Іх Зюзя ператвараў у снегавых ваўкоў.

Наогул жа гэта быў змрочны, нелюдзімы бог, да таго ж вялікі жанчынаненавіснік. У Докшыцкім раёне Віцебскай вобласці сцвярджаюць, што нават багіня кахання і прыгажосці Лада ні'аднаго разу не змагла насладць на яго каханне. Справа ў тым, што яна не пераносіла холаду і не магла наблізіцца да Зюзі на такую адлегласць, на якой дзейнічалі яе чары.

Больш за ўсё прыводзіць у шаленства Зюзю тое, што яго ўлада недаўгачасная, што яго зіму змяняе вясна. Менавіта таму найбольш лютуе ён у апошні зімні месяц. Ці не з-за гэтых яго дзеянняў і названы месяц? Ці не з'яўляецца назва "люты" эпітэтам бога Зюзі? На карысць гэтым меркаванням тое, што люты — адзіны месяц, назва якога па форме прыметнік. Усе ж іншыя, як вядома, назоўнікі.

Нашы продкі вельмі шырока адзначалі свята провадаў зімы — Масленіцу. У зменены (абязбожаным) выглядзе дайшло гэта свята і да нашых часоў. Яно, на наш погляд, прысвечана было таму, каб задобрыць бога зімы. Святкуючыя імкнуліся зрабіць так, каб у наступны свой прыход ён не сарваў на людзях сваю злосць. Больш таго, для свята майструюць пудзіла, якому даюць назву Масленіца. Рытуал спалення гэтага пудзіла з'яўляецца адным з галоўных элементаў свята. Тым самым людзі нібы жадаюць паказаць богу, што не маюць да яго ніякіх прэтэнзій, што ў траскучых маразах, у доўгіх завірухах і ва ўсіх іншых зімовых бедах яны вінавацяць не яго, а гэту "шкадлівую масленіцу". Больш таго, ведаючы адносіны Зюзі да жаночага полу, яны падкрэсліваюць, што іх незадавальненне выклікана дзейнасцю асобы жаночага полу, маўляў, "сам ведаеш, усе беды на зямлі ад гэтых баб". Але як толькі Зюзя ўступіць сваю ўладу, як толькі заляжа на летнюю спячку і нічога не зможа пачуць і ўбачыць, як толькі пачнецца вясна, дык гэтыя хітруны тут жа святкуюць "Гуканне вясны".

Да ўсяго вышэй сказанага трэба дадаць, што ў Зюзі, у адрозненне ад іншых багоў і багінь, няма ні прафесійных, ні ўзроставых, ні сацыяльных функцый. Ён з'яўляецца богам толькі прыроднай з'явы.

Ірына Масляніцына,
Мікола Багадзяж.

і падаецца працоўны каляндар селяніна ў храналагічнай паслядоўнасці. Руплівая збіральніца і даследчыца народнай паэзіі Л.М.Салавей называе валачобную песню "сапраўднай сялянскай паэмай, велічным гімнам земляробу і яго працы" і параўноўвае яе з паэмай Гесіёда "Турботы і дні".

Гісторыя змен у календары, звязаных з перанясеннем святкавання Новага года, няпростая. Рэформы натыкаліся на супраціўленне народа, які даражыў традыцыямі мінулага і не прымаў душою нававядзенні. Яскравых прыкладаў у беларускім фальклоры і абрадах аб святкаванні пачатку года восенню не заўважаецца. Магчыма, толькі некаторыя малапрыкметныя рысы таго захоўваюць Багач і Сямён. Адчуваецца, што мацнейшыя вясновыя і зімовыя традыцыі, якія пусцілі глыбокія карані ў свядомасці народа, не далі развіцца новай рэлігійнай абраднасці ў сялянскім побыце. Тая частка Беларусі, што была ў федэратыўным саюзе з Польшчай, у 1582 годзе перайшла на грыгарыянскі стыль. 9 студзеня 1584 года ў Вялікім княстве Літоўскім выйшла спецыяльная грамата, што прадпісвала адзначаць святы ў новым стылі. Аднак уніяцтва прынцыпова доўга карысталася старым календаром. У 1596 годзе пачынальнікі ўніі Іпацій Пацей і Кірыла Тарлецкі зрабілі спробу пераводу на новы стыль, але яна была няўдалай. У сваю чаргу сінод Рэчы Паспалітай сваімі актамі неаднаразова прадпісваў меры пакарання тым, хто выкарыстоўваў стары стыль. А царскія ўлады ў далучаных беларускіх землях устанаўлівалі стары юліянскі каляндар і жорстка распраўляліся з уніятамі.

(Працяг будзе).

СТАЯЦЬ КАПЛІЦЫ



У далёкім 1912 годзе паблізу Пружан быў пабудаваны помнік-капліца ў гонар стагоддзя бітвы пад Гарадзечна ў Вялікую Айчынную вайну 1812 года. Памятная пліта гаварыла:"Доблесным продкам, загінуўшым у баі пад Гарадзечна". А ў пяцідзесятыя гады ў разгар барацьбы з рэлігіяй капліца была разбурана. І ад сціплага помніка ў гонар перамогі Трэцяй Рускай арміі генерала Аляксандра Тармасава над аўстра-саксонскімі карпусамі напалеонаўскай арміі засталіся толькі руіны.

Цяпер яны адшуканы дзякуючы нястомнай працы ў архівах даследчыка гісторыі роднага краю Леаніда Міхайлавіча Несцерчука. Намеснік начальніка ўпраўлення народнай адукацыі Брэсцкага аблвыканкома прысвяціў далёкай гісторыі родных мясцін кнігу "Айчынная вайна 1812 года на Брэстчыне".

Адшукаўшы даўнейшыя чарцяжы і фотаздымкі капліцы, Л.М.Несцярчук прапанаваў аднавіць гістарычную рэліквію на Пружаншчыне. Грошы на гэтую высакародную справу ахвяравалі жыхары навакольных вёсак, мясцовы калгас імя Дзяржынскага, Брэсцкае панчошнае аб'яднанне, а архітэктурна-праектная творчая майстэрня "Брэстархпраект" падрыхтавала ўжо неабходныя праекты і чарцяжы.

Урачыстае асвячэнне помніка-капліцы адбудзецца восенню 1992 года ў дзень 180-годдзя бітвы пад Гарадзечна.

Э.Кабяк (БЕЛТА)

На здымках:

- Такім будзе помнік праз год.
- Руіны старой капліцы.
- Лявон Міхайлавіч НЕСЦЯРЧУК (злева) са старэйшым жыхаром вёскі Драбучын 95-гадовым Пятром Іванавічам ГАМШЭЕМ. Знаток народнай медыцыны, гісторык і краязнавец Пётр Іванавіч ахвяраваў на пабудову цэркваў у вёсках Гарадзечна, Мокрае, Мурава ўсе свае зберажэнні. У часы пагромаў цэркваў ён выратоўваў унікальныя царкоўныя рэчы, якія зараз вяртаюцца ў храмы.

Фота аўтара.

Водгукі

БЕЛАРУСЫ: балты ці славяне?



Дыскусія, распачатая пасля публікацыі ў "Сумежжы", інтэрв'ю з вядомым маскоўскім археолагам прафесарам Валянцінам Васільевічам Сядовым (гл. "ЧЗ" № 41 за 7—13 кастрычніка 1991 года) працягваецца. У нумары 45-м за мінулы год мы змясцілі водгукі Аляксандра Рогалева і Генадзя Шыйкі, у якіх падаюцца іншыя меркаванні наконт гісторыі славян, балтаў і фінаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Коратка нагадаю галоўную думку В.Сядова: археалогія сабрала дастаткова матэрыялаў, якія бясспрэчна сведчаць, што да Y стагоддзя нашай эры на абшарах цяперашняй Беларусі жылі пераважна балцкія плямёны, з якімі на працягу YI—IX стагоддзяў змяшаліся прыйшлыя славяне. Апошнія ў рэшце рэшт асімілявалі мясцовае балцкае насельніцтва. На гэтым і "вырас" беларускі этнас.

А.Рогалеў даваў іншую думку: апроч балтаў, якія сапраўды былі калісь, свой след у выглядзе тапонімаў (геаграфічных назваў) пакінулі ў нас і іранцы, і фіны, і кельты. Г.Шыйка горача падтрымаў вядомыя высновы Івана Ласкова аб фіна-угорскім паходжанні шматлікіх гідронімаў на Беларусі (назваў рэк, азёр), а таксама ягонае меркаванне, што старажытная Літва — племя не балцкае, а фінскае.

І вось сам Іван Антонавіч Ласкоў, вядомы беларускі пісьменнік з Якуцка, прыслаў у "Сумежжа" аб'ёмны матэрыял, у якім ён аспрэчвае і вывады Сядова, і высновы Рогалева, і працы Тапарова, Трубачова — вядомых даследчыкаў тапаніміі, аўтараў кніг па гісторыі плямёнаў.

Зыходзячы з тэзіса "галоўная прыкмета этнасу — ягоная мова", Іван Антонавіч шукае і знаходзіць расшыфраванне беларускіх гідронімаў у комі-зыранскай, комі-пярмянскай, мардоўскай, марыйскай, эстонскай мовах. Да прыкладу, Стыр — "стирь" (дзяўчына), Цна — "шна" (пас, напруга), Прыпяць — "пири пач" (воўчы хвост), Пліса — "plison" (зубр), Бярэзіна —"беризь" (ліпа), парэшчэ, Днепр — "дон" (чысты) плюс "эб" (моцны) плюс "ор" (рэчышча), Арэса —"арос" (восень) і шмат іншых...

Чаму ж да Ласкова не знайшлі такі шырокі пласт фіна-угорскіх гідронімаў? Сам Іван Антонавіч тлумачыць гэта тым, што нашы тапанімісты не ведаюць фіна-угорскіх моў, не звяртаюць увагі на іх слоўнікі. Ён робіць вывад: гідраніміка на Беларусі пераважна фіна-ўгорская, балцкіх найменняў рэк і азёр амаль што няма.

"Нават у вопытных тапанімістаў заўважаецца перакананасць, што племя магло кудысьці сысці, а назва дадзеная ім, — застаецца. Гэта памылка,— піша далей І.Ласкоў.— Назва заставалася толькі тады, калі людзі, што далі яе, нікуды не рухаліся. Яны пераходзілі на іншую мову, а назву захоўвалі, іншы раз перакладаючы яе на сваю новую гаворку. Так было і з фіна-уграмі Беларусі, якія засялялі яе задоўга да славян, прычым даволі густа, бо фіна-угорскія назвы носяць і зусім малыя рэчкі. З цягам часу пад уплывам суседніх плямёнаў і царквы, фіна-угры зліліся з новапрышлымі народамі. Гэта здарылася гістарычна не так даўно, што паказвае аналіз нашых прозвішчаў, сярод якіх — сотні і сотні пермскага, мардоўскага і іншага фіна-угорскага паходжання... Такім чынам, тапаніміка нязгодная з тым, што беларусы — славянізаваныя балты..."

Іншай пазіцыі прытрымліваецца наш латышскі чытач Юрыс Казлоўскіс з Рыжскага раёна, які ў доказ меркавання аб балцкасці нашых продкаў прыслаў нам тры карты рассялення балцкіх плямёнаў у розныя гістарычныя перыяды, перадрукаваныя з часопіса "Yiedas vestis". Дзве з іх мы публікуем.

А вось яшчэ адна пазіцыя.

"Я не лічу такім ужо важным высвятленне, наколькі мы балты, фіна-угры ці славяне, — піша выкладчык Брэсцкага педінстытута Сафроній Жлоба.— У рэшце рэшт гэта мае значэнне дзеля апраўдання той або іншай палітыкі, а для этналогіі і гісторыі народа — толькі як тлумачэнне з'явы пасіянарнасці і пачатку этнагенезу. (Усё гэта цудоўна распрацаваў Л.М.Гумілёў — вядомы расейскі этнограф)".

В.Кулік.

На картах:
рассяленне балтаў у першай чвэрці II тысячагоддзя да нашай эры;
балты ў YI—YIII стагоддзях нашай эры (1 — прусы, 2 — заходнія галінды, 3 — яцвягі-судавы, 4 — надрувы, 5 — скалвы, 6 — куршы, 7 — жэмайты, 8 — земгалы, 9 — латгалы, 10 — селы, 11 — аўкштайты, 12 — літоўцы, 13 — дняпроўскія балты, 14 — усходнія галінды, 15 — паўднёва-ўсходнія балты).

Сувязі, кантакты

Суайчыннікі з-за мяжы

У якасці бізнесмена нядаўна пабываў у Мінску вядомы беларускі дзеяч з Беласточчыны Віктар Стахвюк. На зімовыя канікулы ў студзені-лютым фірма "Эльвімэкс", створаная ім і яго жонкай Эльжбетай, прывезла да нас дзве турыстычныя дзіцячыя групы з Беласточчыны, каб паказаць вясковым хлопцам і дзяўчатам тэатры, музеі, метро...

Аднак вельмі сумніцельныя значныя грашовыя даходы фірмы Стахвюкоў ад гэтай акцыі — кошт адной пуцёўкі быў максімальна нізкі — 250 тысяч злотых (гэта каля 20 даляраў, якраз столькі каштуе ў нас білет ад Мінска да Беластока з паваротам). А за некаторых дзетак фірма і даплачвала.

Тым не менш, зусім нельга сказаць, што Віктар Стахвюк арганізоўваў і праводзіў два туры вакацый беластоцкіх школьнікаў па Беларусі без усялякай зацікаўленасці са свайго боку. Інтарэс быў. Але іншага парадку.

— Мы хацелі паказаць дзецям, што Беларусь — цывілізаваная і багатая краіна, з моцнай эканамічнай базай і высокаразвітой культурай, і гэтым самым пахіснуць у іх комплексы нацыянальнай меншасці, давесці, што мова беларуская — такая ж людская, як і ўсе, што не варта саромецца яе, а, наадварот, трэба ганарыцца сваім прыналежаннем да нашай нацыі. Спадзяваліся мы, што хоць частка гэтых дзяцей пацягнецца пасля паездкі да беларускіх гурткоў і класаў, — акрэсліў свой інтарэс В.Стахвюк.

Але і Віктар, і яго жонка Эльжбета з пэўнай доляй суму адзначалі, што ўражанне дзяцей ад сталіцы Беларусі атрымалася не такім, якога хацелі б арганізатары экскурсій. Беластоцкія школьнікі канстатавалі сабе, што Мінск — рускамоўны горад, што па-беларуску тут яшчэ гавораць адзінкі, як і ў Польшчы. А шкада, бо ў поўным сэнсе, як прызнаў В.Стахвюк, становішча беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы, ейныя правы і адносіны да яе прама залежаць ад таго, наколькі моцнай будзе наша нацыя тут, наколькі развітай і дужай будзе яе дзяржава.

Наша меншасць у Польшчы, заціснутая цяпер паміж старой праблемай скарачэння да мінімуму беларускамоўнага школьніцтва, з аднаго боку, і ўзнікшай нядаўна магчымасцю страты рэшткаў эканамічнай незалежнасці сялянскіх гаспадарак — з другога, спадзяецца цяпер толькі на сябе ды на росквіт і павышэнне прэстыжу беларускай дзяржавы, не чакае нейкай прамой дапамогі. Рэальнае адраджэнне нацыі тут, безумоўна ж, паўплывае на жыццё нашых суайчыннікаў у Польшчы. Такая пазіцыя Віктара Стахвюка, як сакратара беларускага дэмакратычнага аб'яднання — палітычнай арганізацыі беларусаў РП. Толькі не хацелася б, каб мы, супакоіўшы сябе такою выкладкаю і заглыбіўшыся ў сваіх эканамічных ды адраджэнскіх праблемах, чакалі, пакуль добрыя зрухі ў нас пачнуць павышаць сацыяльны статус беларусаў Польшчы. Гэтак можна і не дачакацца яснага дня для нашых тамтэйшых суайчыннікаў.

Відаць, варта нам узяць прыклад хоць бы з той жа Рэчы Паспалітай, якая значна данімала палякам Беларусі, Літвы. Прыём на вучобу студэнтаў, збор і перадача літаратуры, рэлігійная падтрымка, фонды помачы польскім школам — гэта далёка не поўны пералік сродкаў дапамогі польскай дзяржавы і грамадскасці дзеля адраджэння пальшчызны ў краінах былога СССР.

У тым жа Беластоку на самым зручным месцы размясціўся цэнтр збору кніжак для бібліятэк Віленшчыны, яркія плакаты побач заклікаюць дапамагаць "братам у Літве і на Беларусі". Але чаму ў цэнтры Мінска няма такога ж месца для збору кніжак і часопісаў нашым беластоцкім суайчыннікам?.. Тым больш, што патрэба такая ёсць.

У канцы першага тура, калі закончыліся ўсе экскурсіі, я змог сустрэцца са знаёмцам Янам Морданем, сапраўдным фанатыкам беларушчыны, які прыехаў з дзецьмі ў якасці выхавальніка. Бегаючы з ім і некалькімі яго падапечнымі па кніжных крамах, мы абмяркоўвалі такую праблему: беларускім дзеткам у Польшчы (а Мордань на грамадскіх засадах вядзе заняткі з беластоцкімі школьнікамі, што цягнуцца да роднага слова) няма чаго чытаць. Расказваў Ян, што прыслалі, было, з Беларусі стос кніжак на адрас Таварыства — ды ўсё шматтомнікі, фаліянты, якія не разышліся, відаць, у мінскіх кнігарнях. Іх і давялося аднойчы дарыць дзеткам — пераможцам конкурсу жывога слова... Цікавых кніжак з гульнямі і загадкамі не хапае. Нестае і беларускіх газет, часопісаў.

Ян прасіў знайсці тут якую арганізацыю, што магла б высылаць усё гэта для яго гуртка ды і для іншых беларусаў.

Думаю, не пакрыўдзіцца Ян, калі я ад яго імя папрашу і ў чытачоў "Чырвонай змены" дапамогі дзіцячымі кніжкамі, добрай літаратурай для дарослых на беларускай мове, падборкамі магчыма ўжо прачытаных вамі газет і часопісаў. А месцам збору ўсяго гэтага можна было б зрабіць хоць рэдакцыю "Чырвонкі".

Валер Каліноўскі.
Тэл.: 32-24-96.

На здымку: беластоцкія школьнікі ў час наведвання Музея старажытнага беларускага мастацтва.

Фота Л.Ліцьвіна.

“МОЙ ПРЫНЦЫП – САМАІРОНІЯ”



Віктар Шалкевіч. У нас гэтага чалавека ведаюць як акцёра Гродзенскага лялечнага тэатра, у Польшчы ён набыў папулярнасць як бард, заходнія радыёгаласы гавораць пра яго, як пра парадаксальнага анекдотчыка. Ці не атрымаецца зноў так, што нашых зорак нам адкрыюць за мяжой? Каб чарговым разам не адстаць, мы вырашылі прапанаваць нашым чытачам матэрыял, які прагучаў па радыё “Свабода” напрыканцы студзеня, дзе гучалі і песні, і інтэрв'ю з артыстам.

Адныя з нас позірк кіруюць на захад,
Другія з надзеяй глядзяць на ўсход...
У суквецці вялікіх салідных народаў
Стрычыць мой малы ненадзейны народ.
Я першыя словы з маленства засвоіў,
Як толькі на ножанькі цвёрда ўстаў.
Я гэныя словы на мамчынай мове
Штодзень, як малітву святую, шаптаў:
"Дзякуй, вялікае дзякуй,
Што ваша вяроўка
так моцна не ціснe, не трэ.
Дзякуй, вялікае дзякуй
За тое, што сонца
над стрэхай, а ноч на дварэ.
Дзякуй, вялікае дзякуй,
Што ваша салодкая
лыжка абцёрла нам рот,
Дзякуй, вялікае дзякуй,
Што хаты няма —
брамка ёсць і паваленыя плот...
Вялікае дзякуй!"
Нам так расказалі — ад веку мы спалі,
Збудзілі нас і загадалі: "Устаць!"
Сабралі мы рэчы, папхнулі нас у плечы,
Што больш ужо не можам ні есці, ні спаць.
Затое як кветкі цвіцём, як калоссе,
А нас то касой, то сярпом, то цапом.
Канешне, нямала карысці прыносім:
Маўчым, калі б'юць, і крычым, калі што:
"Дзякуй, вялікае дзякуй!"
Хтось дурнямі лічыць нас, хтось гультаямі,
Хтось любіць нас моцна, хтось моцна кляне.
Даволі нам ласкі чужое! Мы ўстанем.
Падымем галовы і крыкнем: "Досць! Не!"
Дзякуй, нічога не трэба,
Мы годны павагі,
мы — добры, сумленны народ.
Дзякуй вялікае!.. Але
Нам вольнасць найлепшым клейнотам
з усіх узнагарод.
Дзякуй, вялікае дзякуй!
Бо праўду старую мы ўсе зразумелі даўно:
Лепей сваё, ніж чужое,
А мы — сіла! Мы зможам! Мы зробім!
Мы рады дамо!
Мы — народ! Не г...о!!!

– Віктар, ведаем цябе, перад усім, з выступленняў на фестывалі “Басовішча”, з анекдотаў, і некаторыя ведаюць з тэатра ("Тутэйшыя" ды іншыя пастаноўкі). Мо скажы пару слоў пра сябе, адкуль ты ўзяўся?

— Я ўзяўся проста з тэатру. Нарадзіўся ў Поразаве. Дарэчы, гэта, мне здаецца, блізка ад нашай цяперашняй “Лініі Керзона”, калі можна так назваць мяжу, што сёння падзяляе беларусаў. Мястэчка вельмі добра паўплывала на станаўленне маёй нацыянальнай свядомасці. І я, дарэчы, лічу сябе ліцвінам і патрыётам Вялікага княства Літоўскага. Не разумею нават, чаму сыны вялікай дзяржавы пачалі драбніцца на літоўцаў, беларусаў, украінцаў, на ўсё астатняе. Мы — ліцвіны. Магчыма, я страшны ідэаліст, але я мяркую, што Вялікае княства Літоўскае павінна зноў паўстаць. Мы ж маем агульную гісторыю, агульныя традыцыі, маем агульных вялікіх князёў. Мне здаецца, што калісьці (у ідэале) гэтае княства адродзіцца і, магчыма, знойдзецца паўнапраўны нашчадак вялікіх князёў.

Я стаміўся гаварыць тыя ж самыя словы.
Я стаміўся, я хачу памаўчаць.
А на плошчах ізноў — пра народ і пра мову,
Пра былое вялічча крычаць.
Падымаюцца з магілаў сатлелыя цені,
У кіпцюрах — аблезлых лохмаў сцягі.
Сонца зранку раскідае скупыя прамені
Па зямлі, дзе прыходзіцца жыць.
Вуліца, поле, Вялікае княства...
Жаўрукі ў аблоках звіняць...
Вольнаму воля — найвялікшае шчасце,
Нават вецер не дагоніць каня.

– Цікавыя твае погляды на мінулае, на Княства Літоўскае. Ты пішаш шмат песень, спяваеш іх – пра што яны?

— Ведаеш, самае смешнае, што я зусім выбіваюся з, гэтак мовячы, стабільнай беларускай бардаўскай традыцыі. Я калісьці напісаў такі верш:

“Вось і ўсё. Нечаканая восень.
Ані бусла, ані салаўя,
А яны ўсё галосяць-галосяць:
“Беларусь, ах старонка мая!
Ах вы, родныя поле і нівы!”
А я, сволач, брашу і грашу
І крывёю сваёй, не чарнілам,
Гэты верш, бы за кару, пішу.
Эй, пісакі, я добра вас знаю,
Уяўляю, што вам за цана:
Вы сваю Беларусь прадалі бы,
Каб хто даў, за бутэльку віна.

У прынцыпе, я нікога не хачу абразіць, але, разумееш, у нас ёсць нейкая дзіўная традыцыя контрпрапаганды: вось, рабяты, у нас тут Чарнобыль, нас маскалі душылі... Нібыта іншых праблемаў і зусім няма. Дык я паспрабаваў зірнуць на гэтае жыццё з пункту гледжання ліцвіна ці заходняга беларуса. Герой маіх песень — гэта чалавек з мястэчка, які на ўсё глядзіць, як кажуць палякі, з гэткім пшымружэнем ока. Глядзіць і вельмі часта іранізуе з жыцця і, самае галоўнае, з самога сябе. І таму ён застаецца самім сабой.

На пярэзбі музыка іграе,
Народ стаіць і толькі пазяхае,
Бо нейкія з.....цы
Папсавалі танцы,
Худыя, як цвікі,
Кажуць, што бальшавікі.
А помніш, Антак, як таму з тры рокі
У гумны з лесу да нас лёталі сарокі.
А потым Шлёма з Груцаю
Зрабілі рэвалюцыю.
І танцы, пся іх маць,
Усе нам пачалі псаваць.
Аркестра грала польку-трамбляньбляньку,
Я да сябе пяшчотна ціснуў Маньку.
Грукнулі сенцы — завіталі немцы,
У вантробе прыпякло,
Што аж з носу пацякло.
І толькі скрыпку ў рукі ўзяў стары Мікіта,
Каб нам урэзаць танга "Кумпарсіта".
Загаўкалі сабакі — прыехалі палякі,
І стала, брат мой, так —
Тых палякаў, як сабак.
Зноў на пярэзбі музыка іграе,
Народ стаіць і толькі пазяхае,
Бо зноў прыйшлі з.....цы
Зноў папсавалі танцы,
Худыя, як цвікі.
Кажуць, што бальшавікі.

Як я ўжо казаў калісьці, іронія нам дапамагла проста выжыць. Таму мы, заходнікі, і трымаемся, што вельмі іранічна на ўсё глядзелі: на змену ўлады, нават на Чарнобыль. Мой святой памяці нябожчык-бацька любіў казаць гэткую маленькую прытчу: “Крепка Советская власть”, — сказаў бядняк і, горка заплакаўшы, палез на печ.“Вось і ўсё.

– Ты калісьці сказаў, што некаторыя пішуць песні і заклікаюць імі людзей ісці пад танкі, змагацца за штосьці, а сам пішаш песні, каб людзі проста трохі пасмяяліся, каб даць ім нейкую радасць...

— Разумееш, у мяне такі погляд: калі б Кастусь Каліноўскі не вучыўся ў гэтай Вільні і не сядзеў, а паехаў бы ў Парыж ды пісаў мемуары, з яго б было больш толку. Неяк мы заўсёды так падстаўляліся: р-раз,.. кашулю на сябе... маўляў, бярыце мяне, наце. Практычна, мы былі вынішчаныя вось гэтым сваім гераізмам. Я лічу, сапраўды, што народ не трэба пад танкі піхаць, нельга. Народ сам разбярэцца, хто ён такі. Калі мы крычым “народ, свядомасць, мова”, людзі не звяртаюць на нас увагі. Самае дзіўнае, што я, напрыклад, адчуў у іншых праявах, што людзі мяне разумеюць. Гэта, напрыклад, было ў Чанстахове, дзе ў беларускім каталіцкім касцёле мы сустрэліся з гуртом менскай моладзі. Знаёмімся: я, кажу, Шалкевіч з Гародні. У адказ: “О, мы твае песні чулі па "Вольнай Еўропе". Натуральна, я ўжо адчуваю сябе іначай, дамаўляемся на канцэрт для іх. Потым яны са мною развучваюць “Жлобскую нацыю”, а Польскае тэлебачанне тым часам падпільноўвае нас і... паказвае ў эфіры. Потым выступаў перад іншай шоблаю, дзе ўваход — сто рублёў, сядзяць свісткі гэтыя па 17-18 гадоў, пачынаю спяваць, расказваць нейкія анекдоты, пра сябе распавядаць. Пачынаюць сыпацца запіскі: “Исполните, пожалуйста, еще раз "Культпросветработникблюз" і “Не пей, сынок". Гэта класна. Я паўтары гадзіны трымаў залу.

Казалі мне, што я страшэнны
Нацыянальны пень.
Што ўжо з маленства самага малога
І бацька мой, і маці
Так выхоўвалі мяне —
У духу непавагі да чужога:
“Не пі, сынок, віна азербайджанскага, "Агдаму",
Хай п'юць яго азербайджанцы самі,
Гультаі, лахцагі.
Не пі, свіння, маскоўскае гарэлкі,
Слухай тату і маму.
А калі будзе кепска,
Дык нашае палескай
Сапраўднай самагонкі глытані.
З тых пор прайшло амаль паўвеку,
Але, як і тады,
Я запавет бацькоў нашу ў сэрцы:
У рот не бяру чужой гарэлкі,
Не ем чужой яды
З паганага заморскага відэльца.
Няхай жыццё не раз мяне душыла і таптала,
Няхай у морду лез малы і велькі гнюс,
Я помню словы, што калісьці мне казалі
тата і мама.
Я вып'ю самагонкі, я з'ем кавалак сала,
І зноў я чалавек і беларус.

Разумееш, я думаў, што мяне слухае нейкая акрэсленая колькасць людзей (адраджэнцы і гэтак далей). Аказваецца, калі нармальны чалавек, просты беларус, дык яму не чужое ўсё людскае, у тым ліку і адраджэнне. Нікога не трэба нікуды заклікаць, трэба проста людзьмі рабіцца і быць самому па сабе нейкай нармальнай істотай, тады да цябе людзі пацягнуцца.

– А што робіць зараз твой тэатр, чым ты займаешся?

— Я цяпер рыхтую новую праграму. Не хачу забягаць наперад, але мяркую, што абавязкова яе падрыхтую з 10-15 новых песень. Стабільна пішу песні для свайго тэатра. Вось і апошняя пастаноўка нашага тэатра паводле драматургіі Караткевіча пачынаецца маёй песняй, якую вельмі добра аранжыравала менскі кампазітар Ларыса Мурашка. Яна ўзяла маю мелодыю і расклала для сінтэзатараў. Аказваецца, гэта так прыгожа гучыць, ажно самому прыемна, што гэта я напісаў. Пакуль, увогуле, я буду пісаць песні — я буду жыць. Часам нават падлічваю сабе, колькі ж я іх ужо напісаў. Ёсць жа цэлы шэраг песень, якія невядома калі скончу, накшталт “Яна — праваслаўная, я — каталік”, “Выходзіла маці...” ды іншыя. Да многіх я папросту яшчэ недаспеў, але наўрад ці яны састарэюць і маюць патрэбу, каб адляжацца.

Правінцыя...
На каменным крыжы —
Ледзь відочныя замшэлыя словы.
О айчына дабра і зла,
О абрыдлае сірочае гняздо,
Ад голаду і мору,
Патопу і трусу,
Пошасці, нечысці.
Ратуйце ад неспадзяванай смерці,
Ратуйце нас у цяжкую гадзіну,
Праваслаўныя і каталіцкія адзіныя богі!
Правінцыя — хатка, бярозка,
гаёк; масточак,
Рачулка, касцёлік...
Правінцыя, жыта палоска,
Цэркаўка, груша-дзічка, вярба...
Правінцыя,
На тваіх шыбеніцах
Гайдаліся найлепшыя хлопцы,
А твае векавечныя вароны
Выдзёўбвалі ім вочы.
Правінцыя,
На ўсіх вежах спыніліся гадзіннікі
І час у іх бязвінна памёр.
Правінцыя, скрыжаванні дарог...
Ідзі, не дай Божа табе азірнуцца...
Правінцыя, хто хацеў, той і змог
Пайсці, каб ніколі сюды не вярнуцца.
Правінцыя, васілёк на мяжы,
Самотныя зніччы, агеньчык нясмелы...
Правінцыя, не сціхае, баліць
Тваё брыдкае, тваё чорнае цела.

Песні спяваў Віктар Шалкевіч, гутарку вёў Юрка Ляшчынскі.

ЛЮДЗІ І ПРЫВІДЫ

Рэпартаж з наркалагічнага аддзялення Рэспубліканскай псіхіятрычнай бальніцы

На першы погляд, тут усё, як у любой іншай бальніцы. Палаты, сталовая, тэлевізар. Толькі вось краты на вокнах і ўсе дзверы без ручак. Большасць пацыентаў таксама знешне нічым не адрозніваецца ад звычайных. Ёсць некаторыя, іх свае ж называюць "кончанымі". Адзін з іх, змучаны мужчына, гадоў сарака (як мне потым паведамілі, яму ўсяго толькі 27), шаркаючымі крокамі рухаўся па калідоры ўзад-уперад, утаропіўшыся кудысьці прама перад сабой і абсалютна не рэагуючы на навакольных...

Наркалагічнае аддзяленне Рэспубліканскай псіхіятрычнай клінічнай бальніцы.

— Лютаму ворагу такой працы не пажадаю,– ці то жартам, ці то ўсур'ёз заўважае загадчыца аддзялення, маленькая танюткая жанчына з кароткімі светлымі валасамі.– Прыходжу сюды а восьмай гадзіне раніцы, пакідаю работу ў дзевяць вечара. Да канца працоўнага дня ператвараюся ў аднаклетачную істоту. Не хапае часу ні на газеты, ні на тэлевізар, ні на сына. Вечарам толькі паспееш паесці, ужо засынаеш з кавалкам у горле.

ЁН СЯДЗЕЎ, згорбіўшыся, абапёршыся рукамі аб калені. Худы хлопец гадоў дзевятнаццаці. Як потым аказалася, яму 25 гадоў, ён вось ужо два гады жанаты і мае дзіця, дачку двух з паловай гадоў. У клініку яго прывезла міліцыя пасля таго, як яго знайшлі на кватэры ў адной жанчыны, дзе яны ўдваіх варылі "сена". Ён нешта няясна пляце ўрачу, што амаль не колецца, так, бавіцца толькі, не часцей чым раз у месяц. Паказвае мне "сцежку", участак вены барвіста-чырвонага колеру, цвёрды навобмацак ад пастаянных шматлікіх уколаў. Дзіма (так назавём гэтага хлопца):

– Мой бацька – буйны вучоны-фізік, наогул сям'я добрая. Ажаніўся я "па залёту", з-за дзіцяці. З жонкай зараз не падтрымліваю адносін амаль. Так, грашыма, бывае, дапамагаю. Калі б не дачка, мы б былі чужымі людзьмі.

– Калі ўцягнуўся ў наркотыкі?

– Гады два таму. Пазнаёміўся з добрай кампаніяй класных хлопцаў, разам ездзілі ў Вільнюс, рабілі дробны бізнес. Потым нехта прапанаваў мне ўкалоцца за кампанію. Я ўвесь час праводзіў з імі, перастаў начаваць дома, кінуў вучыцца, змяніў некалькі месцаў працы. Апошні час працаваў у каапературыве, шыў курткі, прадаваў. Сабраў каля 80 тысяч.

– Колькі з іх ужо патраціў на мак?

– Тысяч трыццаць, магчыма. У мяне на "кайф" у суткі можа пайсці рублёў 600, хаця гэта таксама ад настрою залежыць.

– Ці хацеў бы кінуць калоцца?

– Не. Я не веру ў дэградацыю і іншую лухту. Калі будзе патрэбна, кіну сам у любы момант. А пакуль... Калі б не было кайфу, даўно наклаў бы на сябе рукі.

– БОЛЬШАСЦЬ з пацыентаў аддзялення,– гаворыць урач,– лічаць сябе выключэннем з агульнага шэрагу наркаманаў. Кожны ўпэўнены ў тым, што ў любы момант здолее адмовіцца ад наркотыкаў, як толькі адчуе нешта кепскае. Але ўся бяда ў тым, што калі нешта кепскае здарыцца, яны ўжо не здолеюць гэта адчуць. Зніжаецца крытычная ацэнка свайго стану.

– Дзіма, а чым ты займаешся, калі не колешся?

– Ем або сплю.

– А потым?

– Калі грошы ёсць – дык зноў, а калі няма, значыць, трэба шукаць.

АДДЗЯЛЕННЮ пацыентаў у асноўным пастаўляе міліцыя. Бывае, яны зноў прыходзяць сюды самі, каб зняць ломку. Калі з-за адсутнасці грошай, ці з іншай нагоды яны не могуць дастаць наркотыкі, арганізм адразу ж рэагуе на гэта. Пачынаецца дэпрэсія, з'яўляюцца болі ў суставах, мышцах: панос, патлівасць. У аддзяленні здымаюць боль і нядаўні хворы просіць, каб яго неадкладна выпісалі, таму што ён абсалютна здаровы. Калі ён выходзіць з бальніцы, то пачынае шукаць сродкі або спосабы дастаць сабе "кайф".

– Прымусовае лячэнне не можа даць ніякіх вынікаў,– гаворыць дацэнт кафедры псіхіятрыі мінскага медінстытута Алег Уладзіслававіч Ліскоўскі.– З дапамогай прымусовага лячэння грамадства не столькі выратоўвае гэтых людзей, колькі ізалюе іх ад сябе. Лячэнне павінна ўяўляць сабой перш за ўсё доўгі працэс па перафарміраванню асобы. Гэтым павінны займацца не толькі псіхатэрапеўты, але і псіхолагі, педагогі, сацыёлагі. Неабходныя падтрымліваючыя структуры: таварыствы ананімных алкаголікаў, наркаманаў. І чалавек перш за ўсё павінен жадаць вылекавацца сам. Хаця, канешне, зараз, у перыяд такой палітычнай і эканамічнай нестабільнасці цяжка гаварыць аб нейкай сур'ёзнай, прынцыпова новай і сапраўды эфектыўнай сістэме лячэння наркаманіі. Для гэтага неабходны вялікія сродкі, падтрымка на ўзроўні дзяржавы.

Захапленне наркотыкамі пачынаецца, як правіла, з курэння анашы, якая сама па сабе моцнай фізічнай залежнасці не выклікае. Аднак малады чалавек,які паліць траўку для карэкцыі сваіх псіхалагічных праблем, у рэшце рэшт прывыкае да яе – памяншаецца вастрыня ўспрыняцця "кайфу", хочацца чагосьці больш моцнага. Рана ці позна ён "садзіцца на іголку".

У Беларусі ў асноўным распаўсюджана опіўная (мак) наркаманія. У гэтым выпадку фізічная залежнасць узнікае хутка, пасля адной-дзвюх ін'екцый. Яна моцная і захоўваецца на вельмі доўгі час. З прывыканнем да наркотыку адбываецца дэфармацыя асобы. Чалавек больш не цікавіцца кар'ерай, працай, вучобай, становіцца абсалютна абыякавым да сексу. Грошы для яго адыгрываюць ролю толькі як сродак атрымаць "кайф".

Сашу 23 гады. Ён скончыў восем класаў і ПТВ. Вучыўся пасрэдна. Пасля арміі працаваў вартаўніком. Маці няма, жыве з бацькам-алкаголікам. Любіць адзіноту, не верыць у людзей і каханне. Некалькі разоў імкнуўся скочыць самагубствам.

Анашу курыць з 17 гадоў. Паводле ягоных слоў, яна дапамагае яму быць упэўненым у сабе, менш увагі звяртаць на розныя паскудствы. Пасля курэння ён адчувае лёгкасць, свабодны палёт.

– Я не магу жыць у гэтым жудасным свеце і наркотыкі ніколі не кіну. Дзякуючы "траве" жыццё маё светлае і яркае.

На першы погляд, тут усё, як у любой іншай бальніцы. Але пацыенты тут падобны да прывідаў, што з-за пэўных акалічнасцей выпадкова аказаліся ў свеце рэальным. У свеце, ад якога яны так настойліва імкнуцца збегчы. Мне шкада гэтых людзей: яны нарадзіліся, каб не жыць...

Аляксей Краўчанка.
Фота С.Брушко.



Гісторыя аднаго забойства

Дом на ўскраіне

I

Вёска Крамянец Лагойскага раёна захварэла некалькі год таму, калі ў неахайнай хацінцы на самым яе ўскрайку пасяліўся рабочы мясцовага саўгаса Яўген Р. разам са сваёй сужыцелькай Алінай П. Бо вёскі — як людзі: здароўе іх *вялікіх і маленькіх* арганізмаў вызначаецца жыццяздольнасцю асобных "клетачак" — ячэек грамадства. А дом Яўгена і Аліны аднавяскоўцы даўно абыходзілі бокам: ці ж гэта не прыкмета хваробы?

Соф'я Архіпаўна М., суседка Яўгена і Аліны:

— Жылі яны дрэнна, часта п'янствавалі, Яўген біў Аліну.

Альжбета Р., маці Яўгена:

— Прапівалі ўсе грошы і маёмасць. Бойкі і сваркі былі між імі пастаянна.

Аліна Р., яшчэ адна суседка:

— Аліна ўвесь час хадзіла з сінякамі. У мінулым годзе Яўген прыйшоў да яе на працу і збіў віламі...

Хоць шлюб Аліны і Яўгена не быў зарэгістраваны, займелі яны двух дзяцей: сына Сашу ў 89-м годзе і дачку Кацярыну ў 91-м. Пра тое, як "выхоўваліся" ў гэтай сям'і дзеці, сведчыць маці Яўгена:

— Аліна мала таго, што сама *піла, давала гарэлку дзецям*, каб "добра спалі"... Яўген і Аліна ніколі не мыліся самі, не мылі і дзяцей...

Начальніка крымінальнай міліцыі раёна Сцяпана Аляксандравіча Яраша тэлефонны званок разбудзіў на світанку 6 лістапада 1991 года. Хутка опергрупа прыбыла на месца здарэння — у хату Яўгена і Аліны. У твары міліцыянерам дыхнула цяжкім паветрам бруднага, запушчанага памяшкання, перамешаным з пахам крыві. Пасярэдзіне пакоя, на падлозе паміж раскіданымі рэчамі, ляжала мёртвая жанчына са слядамі шматлікіх пабояў і адной вялізнай — смяротнай — ранай на грудзях. Акрываўлены нож быў знойдзены непадалёку ад уваходу ў хату. Побач у дзіцячай калысцы спала маленькая дзяўчынка.

Сведка Соф'я Архіпаўна М.:

— Напярэдадні вечарам у наш магазін завезлі гарэлку, і я бачыла, як Яўген пасылаў па яе Аліну. А на світанку да мяне прыбегла яго маці са словамі: "Мой гад, фашыст, відаць, забіў Алю..."

Сведка Альжбета Р.:

— 6 лістапада ў 4 гадзіны раніцы да мяне прыбег сын і сказаў, што Аліна зарэзалася. Калі мы разам прыбеглі ў хату, то я ўбачыла, што яна сядзіць на стуле ля акна, побач валяўся нож. Яна была ўжо мёртвая.

Судова-медыцынская экспертыза налічыла каля пяцідзесяці "кантактаў" цела Аліны з траўміруючымі прадметамі. На вопратцы Яўгена была выяўлена кроў, якая адпавядала групе крыві забітай. Акрамя таго, эксперты ўстанавілі, што Аліна была цяжарная.

Здавалася б, усё сведчыла пра тое, што забойства ўчыніў сужыцель жанчыны — Яўген Р. Аднак сам ён, затрыманы ў якасці падазраваемага, паказаў, што прачнуўся ў гэту ноч ад дзіцячага плачу і ўбачыў Аліну ўжо мёртвай. Але хата была зачынена знутры, чужых слядоў выяўлена не было. У хуткім часе быў дапрошаны брат Яўгена, які расказаў:

— Аліна піла больш, чым брат, ужывала нават сурагаты. Тое, што адбылося, я лічу, адбылося з-за гарэлкі, таму што Аліна мела моду хаваць ад Яўгена гарэлку ці проста красці, і за гэта ён яе пастаянна біў, а яна казала, што няхай лепей ён яе заб'е, чым яна прызнаецца...

Двое маленькіх дзяцей, якія засталіся без нагляду, былі здадзены ў дзіцячы дом: маці Яўгена не захацела браць іх да сябе, растлумачыўшы, што не ў стане даглядаць іх з-за сталага ўзросту.

II

Я наўмысна пабудаваў свой аповед пра гэта жудаснае злачынства на дакументах і сведчаннях. Бо цяжка дадаць што-небудзь да скупых радкоў міліцэйскіх пратаколаў. Следства па гэтай справе хутка будзе скончана. Наперадзе суд, які ўстановіць, ці забіваў Яўген Р. сваю сужыцельку. Мяне ж гэта даволі звычайная для нашага часу крымінальная гісторыя навяла на іншыя думкі. І галоўная з іх: дзе ж былі навакольныя людзі? Паводле слоў аднавяскоўцаў, усе п р ы в ы к л і, што Аліна П. "ходзіць з сінякамі", што маленькія яе дзеці застаюцца нямытымі і амаль някормленымі. Саўгас, у якім працаваў Яўген, паспяшаўся прадаставіць следству адмоўную характарыстыку на яго: працаваў дрэнна, прапіваў саўгасную маёмасць (за што і быў судзімы)... Навошта ж было тады даваць яму саўгасны дом, дазваляць заводзіць "пазашлюбную" сям'ю, ведаючы прытым, што і Аліну раней судзілі за крадзеж? Мне могуць запярэчыць, што ў нас вольнае грамадства і кожны сам выбірае, як яму жыць. Аднак чаму ж тады ніхто не прыйшоў на дапамогу хаця б дзецям гэтых душэўна і фізічна хворых людзей (спадзяюся, нікога не трэба пераконваць у тым, што алкагалізм — гэта хвароба)? Верылі ў тое, што самі "вылечацца"?

Вядома ж, я разумею, што пытанні гэтыя рытарычныя. І стаўлю іх таму, што ведаю адказ. І ўсе ведаюць: сённяшняя вёска прывыкла да п'янства, а значыць, п р ы в ы к л а і да таго, што мужык можа "пад гарачую руку" пакалаціць жонку. Прывыкла да самагону, да ўсялякай атруты, бо "магазінная" гарэлка — па спісах, талонах, купонах. І калі цяпер першыя асобы дзяржавы ўжо не лічаць ганебным пахваліцца ўменнем глынуць пляшку-другую "Белавежскай", то чым пахваліцца вясковаму мужыку, які прывык "мачыць" і смутак, і радасць, і проста цяжкія будні? Самагонам, вытворчасць якога паранейшаму забараняе дзяржава? Ці дыхлафосам, калі няма самагону, бо апошні ж яшчэ трэба з нечага зрабіць? Скарацiўшы вытворчасць спіртнога, узняўшы на яго кошт, адначасова стварыўшы дзесяткі тысяч розных таварystваў і камісій цвярозасці, на самай справе дзяржава і пальцам не варухнула, каб рэальна дапамагчы нашай пакуль часткова хворай на алкагалізм вёсцы. Калі раней дысцыпліну ў калгасах і саўгасах падтрымлівалі з дапамогай бізуна, то цяпер прыедзьце ў любы дзень у любую гаспадарку пасля абеду, палічыце, колькі сялян цвярозых... І гэтай вёсцы — рыначную эканоміку, прыватызацыю зямлі?! Ды ці не з глузду з'ехалі нашы палітыкі і эканамісты? Я не пра тое, што рынак і прыватызацыя нашай аграрнай рэспубліцы не патрэбныя; я пра тое, што спачатку трэба элементарна навесці с а ц ы я л ь н ы парадак на вёсцы, у тым ліку вырашыць праблему "ціхага алкагалізму". Пакуль просты мужык не перайшоў на дыхлафос, сурагаты і гэтак далей.

Павел Сіманаў,
спецыяльны карэспандэнт
"Чырвонай змены".

Лагойскі раён.

ІНФА-КРЫМ

Смяротны канвеер

спыніла нядаўна віцебская міліцыя. На трох мясцовых прадпрыемствах — заводзе імя Кірава, аб'яднаннях "Рамбыттэхніка" і "Электравымяральнік"— мафія наладзіла падпольны выпуск зброі. У арсенале "прадпрымальнікаў" былі пісталеты, вінтоўкі, аўтаматы і нават гранаты. Зброя канфіскавана, вядзецца следства.

Тэатральная сустрэча

Яе арганізавалі ў гарадскім пасёлку Крупкі ўладальніку машыны "Форд" некалькі злачынцаў, адзін з якіх быў пераапрануты ў міліцэйскую форму. Пагражаючы нажом, рабаўнікі прымусілі гаспадара пакінуць машыну і ўгналі б яе, калі б не сапраўдная міліцыя, якая затрымала няўдалых "акцёраў".

На "белыя тапачкі"

У мінулым выпуску "Інфа-крыма" мы паведамілі пра выпадак, які здарыўся на адной з вуліц Мінска: рабаўнікі адабралі ў прахожай бабулькі 4 рублі. Аналагічнае здарэнне адбылося ў сталіцы на гэтым тыдні: на вуліцы Валгаградскай невядомы, пагражаючы фізічнай расправай, адабраў у пенсіянеркі сумку з 7 рублямі. Хочацца пажадаць яму выкарыстаць гэтыя грошы сабе на "белыя тапачкі". Якраз хопіць.

Забытая слава

Кароткі агляд ваеннай гісторыі Беларусі

(Працяг. Пачатак у №№ 7, 8.)

V

У другой палове XV ст. на паўднёвых межах Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага з'явіўся моцны і небяспечны вораг — Крымскае ханства. Гэтая дзяржава ўтварылася ў выніку распаду калісь магутнай Залатой Арды. Крымскія ханы, татарскія вярхі жылі за кошт пастаянных нападаў на суседнія землі. Войны і рабункі былі заўжды іхнім рамяством і сродкам існавання. Асаблівую каштоўнасць для татараў уяўлялі палонныя, у першую чаргу маладыя і дужыя людзі, якіх яны потым прадавалі за вялікія грошы на нявольнічых рынках Крыма і Турцыі. Вялізным попытам карысталіся дзяўчынкі, якія папаўнялі ханскія і султанскія гарэмы.

Галоўным аб'ектам для сваіх спусташальных набегаў крымскія ханы абралі багатыя, урадлівыя землі свайго паўночнага суседа — Вялікага княства Літоўскага. Апроч прагі да нажывы, іх падштурхнула на тое і палітычная прычына: у 1480 годзе паміж крымскім ханам Менглі-Гірэем і маскоўскім уладаром Іванам III было заключана пагадненне аб сумеснай барацьбе з Вялікім княствам Літоўскім. Крымскі хан паабяцаў Маскве ваяваць землі вялікага князя літоўскага Казіміра.

Першымі пад удар крымчакоў трапілі паўднёвыя землі Вялікага княства Літоўскага — Падолле, Валынь, Кіеўшчына, Ноўгарад—Севершчына. Татары палілі гарады і вёскі, рабавалі цяжкай працай нажытае дабро, выводзілі ў палон насельніцтва. Наезды на землі Вялікага княства рабіліся штогод, а часам — некалькі разоў на год. Шматлікія мурзы і князі, ханскія сыны, маючы свае ўласныя войскі, рабілі самастойныя набегі. У 1482 годзе крымчакі, падбухтораныя Іванам III, захапілі старажытны Кіеў, спалілі Пячорскі манастыр, разрабавалі святыню ўсіх праваслаўных жыхароў Вялікага княства Літоўскага — Сафійскі сабор. Пасля такога злачынства Менглі-Гірэй падараваў шэраг нарабаваных упрыгажэнняў з Кіеўскай Сафіі абаронцу "истинного православия" маскоўскаму князю Івану III, якія той з удзячнасцю прыняў. З канца XV ст. крымскія татары ўрываліся і на тэрыторыю сучаснай Беларусі. У 1497 годзе недалёка ад Мазыра яны забілі мітрапаліта кіеўскага і ўсея Русі Макарыя. Пад час вайны 1500—1503 гадоў паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскаю дзяржаваю Іван III неаднаразова інструктаваў Менглі-Гірэя, каб крымскія загоны накіроўваліся ў бок Слуцка, Турава, Пінска, Менска з мэтай паслабіць заплечча абароны на ўсходняй мяжы Вялікага княства Літоўскага. Карыстаючыся тым, што асноўныя сілы Вялікага княства Літоўскага знаходзіліся на ўсходзе дзяржавы, дзе ваявалі з Масквою, крымчакі ў гэты час пастаянна пустошылі беларускія землі. У 1500 г. яны спалілі Бярэсце і ягоныя ваколіцы, восенню 1502 года перайшлі Прыпяць і пачалі ваяваць за землі каля Турава, Пінска. Славуты слуцкі князь Сямён Міхайлавіч Алелькавіч перахапіў крымчакоў у 6 мілях ад Бабруйска, на рацэ Уша, ушчэнт разбіў іх, вызваліўшы з няволі ўвесь палон. У наступным 1503 годзе 6-тысячны татарскі аддзел, узначалены сынам самога хана Біці-Гірэем, прыйшоў пад Слуцк і стаў там кошам (лагерам). Распушчаныя па Беларусі татарскія загоны спустошылі аколіцы Капыля і Нясвіжа, спалілі Клецкі замак. Даведаўшыся пра падыход вялікага войска, татары павярнулі назад і адышлі ў Крым са значным палонам. У тым жа 1503 годзе 3-тысячны татарскі аддзел зноў спустошыў аколіцы Слуцка, ваяваў недалёка ад Наваградка. На гэты раз ім не ўдалося вольна вярнуцца ў Крым. Войска Вялікага княства Літоўскага на чале з Сямёнам Алелькавічам, Станіславам Кішкам, Юрыем Неміровічам і Альбрэхтам Гаштольдам дагнала татараў за мілю ад Давыд-Гарадка і разбіла іх.

Рыцар Вялікага княства Літоўскага XV ст.

У 1505 годзе крымчакі ажыццявілі самы спусташальны набег на Беларусь. Тры ханскія сыны — Махмет-Гірэй, Біці-Гірэй і Бурнас, пераправіўшыся са сваім войскам цераз Дняпро ля Лоева, дзе знаходзіліся знакамітыя "татарскія броды", накіраваліся ў цэнтр Беларусі. Старэйшы царэвіч Махмет-Гірэй павёў свой аддзел у накірунку Менска і далей Полацка, Друцка, Віцебска, а ягоныя малодшыя браты пайшлі пад Слуцк. Татары спрабавалі ўзяць слуцкі замак, але мужныя случчакі адбілі ўсе іхнія атакі. Тады Біці-Гірэй і Бурнас рушылі пад Навагрудак, але і там замкавы гарнізон на чале з намеснікам Альбрэхтам Гаштольдам і гараднічым Маскевічам прымусіў іх адступіць ад гарадскіх муроў. Татарскія загоны папалілі тады аколіцы шмат якіх беларускіх гарадоў, пазнішчалі вёскі і вывелі ў Крым вялізны палон.

Спадзеючыся на беспакаранасць, летам 1506 года Біці-Гірэй і Бурнас на чале 30-тысячнага войска ўварваліся на Беларусь. Татары сталі кошам каля Клецка, распусціўшы загоны ў наваградскім накірунку. Але на гэты раз яны не ўніклі адплаты. Зрабіўшы імклівы пераход ад Ліды да Клецка, менскія, наваградскія і гарадзенскія апалчэнцы пад кіраўніцтвам князя Міхаіла Глінскага дазвання разграмілі татараў 6 жніўня пад Клецкам. Тысячы варожых трупаў засталіся ляжаць на берагах рэк Лань і Цапра. Быў вызвалены вялікі палон у 40 тысяч чалавек, якіх крымчакі збіраліся вывесці ў свае ўладанні.

У далейшым, нягледзячы на шэраг замірэнняў з Вялікім княствам Літоўскім, крымскія татары працягвалі пустошыць беларускія землі. Найбольш буйнымі былі іхнія набегі ў 1508, 1510, 1521, 1527 гг. З мэтаю абараніць краіну ад татарскіх нападаў, а ім спрыяла слабасць паўднёвых межаў краіны, новы вялікі князь літоўскі Жыгімонт II павялічыў "узмежную старожу", узмацніў замкі і крэпасці перадавым узбраеннем і ратнымі людзьмі. У планах Жыгімонта II былі і шырокія наступальныя аперацыі супраць Крымскага ханства. Ваенныя мерапрыемствы і дыпламатычныя захады Вялікага княства Літоўскага далі ўрэшце дзейсныя вынікі. У 1527 годзе войска Вялікага княства Літоўскага, якім кіравалі гетман Канстанцін Астрожскі, слуцкі князь Юры Сямёнавіч Алелькавіч (сын знакамітага Сямёна Алелькавіча) і чаркаскім ваяводаю Аставіем Дашковічам разбіла ўшчэнт 24-тысячнае татарска-турэцкае войска ля Альшаніцы, у 40 мілях ад Кіева. Пасля таго, як у 1530 годзе князь Іван Дубровіцкі разграміў у чарговы раз крымскіх наезнікаў, якія ўварваліся на Беларусь, іхнія напады на Вялікае княства сталі радзейшымі і менш адчувальнымі.

VI

У канцы XV стагоддзя, калі Маскоўская дзяржава ўвабралася ў сілу і, падбіваючы суседнія землі, усутык падышла да межаў беларуска-літоўскага гаспадарства, вялікі князь маскоўскі Іван III адважыўся на адкрытую экспансію. Чыста захопніцкая палітыка была абгрунтавана тэзісам аб праве Масквы на абшары ўсёй былой імперыі Рурыкавічаў. Абвясціўшы тэрыторыі Беларусі і Украіны сваімі, маскоўскі ўладар падгаварыў крымскага хана больш актыўна нападаць на Беларусь з поўдня ды ў 1492 годзе распачаў першую вайну супраць Вялікага княства Літоўскага. Адразу тры вялікія арміі з розных бакоў увайшлі ў беларуска-літоўскае гаспадарства ды хутка занялі шэраг гарадоў. Вільня зусім не чакала інтэрвенцыі і не рыхтавалася да адпору. Вялікае Княства больш як паўстагоддзя наогул ня ведала войнаў. Новы гаспадар Аляксандр хацеў залагодзіць канфлікт і накіраваў у Маскву паслоў са скаргамі на беспрычыннае парушэнне міру Маскоўскай дзяржавай ды прапанаваў спыніць вайну. Яго стараннямі ў 1494 годзе было заключана новае замірэнне, замацаванае дынастычным шлюбам: дачка маскоўскага ўладара Алена выходзіла за вялікага князя Аляксандра і пераязджала ў Вільню.

На жаль, сваяцтва манархаў не прынесла спакою ўсходнім межам Беларусі. Спачатку Іван III актывізаваў крымскіх татараў, якія штогод нападалі на Вялікае Княства, а ў 1500 годзе сам распачаў чарговую захопніцкую вайну. Вялікі князь Аляксандр спрабаваў ізноў апеляваць да сумлення, пісаў цесцю, што беларуска-літоўская дзяржава не мае аніякай віны перад Масквой, прасіў не праліваць больш хрысціянскай крыві, адзначаў, што адказнасць за ўсё кладзецца на Івана III — парушальніка клятвы. Але марна. Маскоўскае войска тым часам займала новыя землі — Севершчыну, Браншчыну, гарады і воласці Смаленшчыны.

Гетман Найвышэйшы Канстанцін Астрожскі званы Ганібалом.

Бараніць межы краіны паспяшаўся князь Кастусь Астрожскі — найвышэйшы гетман (галоўнакамандуючы) Вялікага княства Літоўскага. Вясной 1500 года ён сабраў у Вільні вершнікаў — каго паспеў — ды хутчэй рушыў праз Менск да Смаленска. Маскоўскія ваяводы стаялі каля Дарагабужа. Іх аб'яднаныя сілы сягалі 40 тысяч ратнікаў, а ў Астрожскага мелася толькі 4 тысячы. Здавалася, весці 4 на 40 — самагубства! Але гетман пасля нядоўгай нарады вырашыў: "Мала ці многа масквічоў будзе, ды толькі ўзяўшы Бога ў падмогу біцца з імі, а ня біўшыся — назад не вяртацца". Сеча адбылася 14 ліпеня пад Дарагабужам. Малалікая конніца Астрожскага спачатку ашаламіла ворага атакай, але потым, сціснутая маскоўскімі палкамі, цалкам прайграла бітву. Загінулі лепшыя вайсковыя сілы Вялікага Княства, сам гетман трапіў у палон. Гэта была першая значная перамога маскоўскага войска над беларуска-літоўскім у полі. Праўда, ваяводы Івана III мала пакарысталіся такім поспехам. Яны займаліся пераважна пусташэннем воласцяў.

Тым часам Вялікае Княства падпісала ўнію з Польшчай, заключыла дыпламатычны саюз з Ордэнам і Заволжскай Ардой і гэтым прымусіла Маскву пайсці на перамовы. У 1503 годзе Масква і Вільня падпісалі дамову аб замірэнні на 6 год. Па ўмовах замірэння беларуска-літоўскае гаспадарства страчвала вялізныя тэрыторыі з гарадамі Чарнігаў, Ноўгарад-Северскі, Бранск, Любеч, Старадуб, Мцэнск, нават Гомель ды інш. Але і на гэты раз мір пратрываў нядоўга.

Чарговая, трэцяя па ліку вайна пачалася ўжо ў 1506 годзе, калі Васіль III кінуў на край два шматтысячныя злучэнні, якія пустошылі Беларусь па Бярэзіну. У 1508 годзе ён прыслаў маскоўскія палкі пад Бабруйск на дапамогу здрадніку князю М. Глінскаму, каб на гэты раз зваяваць Беларусь супольна з бунтаўнікамі. Разам яны аблажылі Менск і адсюль рабілі спусташальныя рэйды ажно да Слоніма. Толькі з'яўленне К.Астрожскага,які ўцёк з маскоўскага палону, змусіла 30-тысячную армію непрыяцеля адступаць да Воршы, а пасля, збаяўшыся бітвы, і зусім пакінуць межы Беларусі. Восенню 1508 года маскоўскі манарх падпісаў новае пагадненне аб міры з Вялікім княствам Літоўскім. Аднак ізноў нядоўга трываў без вайны.

Ужо на лета 1512 года стала вядома, што вялікі князь маскоўскі рыхтуе чарговую інтэрвенцыю разам з нямецкім Ордэнам. Восенню галоўныя сілы Васіля III аблажылі Смаленск, а іншыя палкі пайшлі на Воршу, Друцк, пустошылі край ажно да Менска і Віцебска. Не авалодаўшы Смаленскам, але, страціўшы пад час аблогі нямала жывой сілы, маскоўскі ўладар адвёў войска, а летам 1513 года распачаў новую наступальную кампанію. На гэты раз у дапамогу яму Святая Рымская Імперыя прыслала сваю пяхоту і артылерыю. Разам пад Смаленскам зграмадзілася каля 80 тысяч ратнікаў. Але смаленцы настолькі мужна адбіваліся, што Васіль III праз колькі месяцаў мусіў зняць безвыніковую аблогу. Трэці смаленскі паход быў прызначаны на лета наступнага года. Маскоўская дыпламатыя разам з імператарам Максімільянам утварылі ваенную кааліцыю з сямі дзяржаў супраць Вялікага княства Літоўскага і Кароны Польскай. У Маскве хаўруснікі вырашылі пасля перамогі падзяліць заваяваныя абшары: Васіль III забраў бы беларускія і ўкраінскія землі, а Максімільян І — польскія.

80-тысячнае войска прыйшло пад Смаленск у ліпені 1514 года і пачало няспынны абстрэл горада з 300 гармат. Праз колькі тыдняў абаронцы з палаючых умацаванняў папрасілі спыніць абстрэл, а яшчэ па якім часе згадзіліся капітуляваць на льготных умовах. Акрыленыя поспехам маскоўскія ваяводы паспяшаліся ў глыб Беларусі. Страта галоўнай фартэцыі на ўсходзе ашаламіла Вялікае княства Літоўскае. Пасля Смаленска паддаліся Мсціслаў, Крычаў, Дуброўна.

Войска Вялікага Княства — каля 35 тысячаў — толькі падыходзіла да Бярэзіны. Ваяводы Васіля III, маючы больш чым двайную перавагу ў сіле, вырашылі даць генеральную бітву, каб цалкам разграміць харугвы К.Астрожскага і тады ўжо гаспадарыць у зусім безабароннай краіне. Яны зграмадзіліся за Дняпром на беразе рачулкі Крапіўны, што паміж Воршай і Дуброўнай. На досвітку 8 верасня 1514 года перад імі з'явіліся шыхты войска К.Астрожскага. Пачалася бітва, ад якой залежаў гістарычны лёс беларусаў ды іншых народаў Вялікага княства Літоўскага.

Гетман найвышэйшы, род якога паходзіў з турава-пінскіх князёў, бліскуча скарыстаў сваё тактычнае майстэрства і дазвання разграміў агромністую армію Маскоўскай дзяржавы. Гэтая перамога стала абаронай суверэнітэту краіны. Святая Рымская імперыя адмовілася ад ваеннага блоку з Масквой, і ўвесь небяспечны альянс разваліўся. Пра перамогу К.Астрожскага над Масквой уведала ўся Еўропа. Яе святкаваў сам папа рымскі, а імператар Максімільян стаў абаронцам інтарэсаў Вялікага княства Літоўскага на Захадзе. У 1518 годзе, пераконваючы магістра нямецкага ордэна не дапамагаць Маскве весці захопніцкія войны, ён напісаў: "Цэльнасць Літвы (чытай — Вялікага княства Літоўскага) карысна для ўсёй Еўропы, магутнасць Масковіі — небяспечная". Славутая бітва на Крапіўне ўвайшла ў еўрапейскія хрэстаматыі па ваеннай гісторыі як узор перамогі малалікага войска над колькасна перавышаючым ворагам. А на Беларусі Аршанскую бітву апявала гістарычная народная песня, услаўлялі летапісцы. Гетмана К.Астрожскага называлі Сцыпіёнам, Ганібалам, а ягоных ваяроў параўноўвалі са славутымі македанянамі.

(Працяг будзе).

2, панядзелак

Беларускае тэлебачанне

16.30. Навіны.
16.35. Выяўленчае мастацтва. 6-ы клас.
• 17.00. "Дзядзечка Агу". Мультфільм. Часткі 1, 2, 3-я.*
18.00. "Сялянскі статус". Дак. фільм.
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Брэст).
19.35. Наш каментарый. "Зямля чакае".
19.45. Чарнобыль: праблемы і вырашэнні.
20.05. Іграе Нарыман Гайфулін (гітара).
20.25. Калыханка.
20.45. Ліра. Частка 1-я.
21.35. ВІА "Арызонт". Фільм-канцэрт.
22.00. Спартыўны тэлекур'ер.
22.20. Ліра. Частка 2-я.
23.20. НіКа.

1 канал, Астанкіна

15.00. Міжнародны тэлемарафон "Салдаты XX стагоддзя супраць вайны".
17.00. Навіны.
17.20. Футбольны агляд.
17.50. Міжнародны тэлемарафон. Працяг.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Аўтарскае тэлебачанне. "Прэс-клуб".
23.00. Навіны.
23.25. Да вынікаў Міжнароднага тэлемарафона.

Канал "Расія"

7.00. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
8.20. Італьянская мова.
8.50. Вольны час. "Дай лапу, сябар!"
9.05. Міжнародны тэлемарафон "Салдаты XX стагоддзя супраць вайны".
13.00. Весткі.
13.20. Міжнародны тэлемарафон. Працяг.
15.00. Дзіцячая гадзіна (з урокам французскай мовы).
16.00. "І пакінь нам даўгі наша..." Свята дабрачыннасці ў Курску.
16.45. Т.Ін.Ка.
17.00. "Вясковае вяселле". Фальклорная праграма.
17.30. Вольны час. "Калекцыянер".
17.45. "Тварам да Расіі".
18.00. Музычная праграма.
18.25. Наш сад.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. "Салдаты XX стагоддзя супраць вайны".
20.55. Пятае кола.
22.00. Весткі.
22.20. Пятае кола. Працяг.
23.05. Авангардны джаз: іграе ансамбль "Архангельск".

3, аўторак

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. "Вяцкія карункі". Кінанарыс.
9.00. Выяўленчае мастацтва. 6-ы клас.
9.25. "Канва жыцця". Дак. фільм.
10.15. "Роднае слова". Тэлечасопіс.
• 11.15. "Сакрэтны фарватар". Маст. фільм. 1-я серыя.
16.30. Навіны.
16.35. Музыка і спевы. 2-гі клас.
• 16.50. Экран дзіцячага фільма. "Залатыя рогі".
18.00. Ці можна давяраць чыгунцы? Перадача з Віцебска.
18.30. "Хлопец з вёскі Белае". Дак. фільм.
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Віцебск).
19.35. Наш каментарый. "Кожны сорак чацвёрты..."
19.40. Эканамічная хваля. Каму поле засяваць? У перапынку (20.25.) – Калыханка.
21.00. Тэлебіржа.
• 21.15. "Мільён у шлюбным кошыку". Маст. фільм.
22.45. А.Ліцвіноўскі. Містэрыя "Францыск".
23.30. НіКа.

1 канал, Астанкіна

5.00. Раніца.
• 7.35. Мультфільмы.
• 8.05. Фільм – дзецям. "Вясёлыя сны, ці Смех і слёзы". 1-я серыя.
9.10. Выступае Р.Султангарэева.
9.25. Футбольны агляд.
9.55. Творчы партрэт Марлена Хуцыева.
11.00. Навіны.
11.25. Рытмічная гімнастыка.
11.55. "Падарожжа ў Радопы".
• 12.10. Мультфільм.
12.30. Экалогія. Грамадства. Чалавек. "Нафтавае шчасце".
13.00. Свет грошай Адама Сміта.
13.30. Блакнот.
13.35. Вам гэта трэба?
13.45. Гандлёвы рад.
14.00. Навіны.
14.25. Праслаўленыя савецкія баксёры мінулых гадоў.
• 14.45. "Хуаніта ля Ларга". Маст. фільм.
16.45. Разам з чэмпіёнамі.
17.00. Навіны.
17.25. Амерыка: куды ідзе поезд Буша.
• 17.50. "Капрызны Мурад". Мультфільм.
18.00. "Чорная скрыня".
18.40. Творчы партрэт Марлена Хуцыева.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. Хакей. ЦСКА–"Крылы Саветаў".
• 21.40. Маст. фільм "Лэдзі Макбет Мцэнскага павета".
23.00. Навіны.
23.25. У свеце матораў.
• 23.55. "Хуаніта ля Ларга". Маст. фільм.

Канал "Расія"

7.00. Весткі.
7.20. Французская мова. 1-ы год навучання.
7.50. Вольны час. "Кветкі ў доме".
8.05. Французская мова. 2-гі год навучання.
8.35. Дзіцячая гадзіна (з урокам французскай мовы).
9.35. XX стагоддзе: у кадры і за кадрам.
10.35. Пятае кола.
12.20. Сялянскае падвор'е.
12.45. Прыватызацыя парасійску.
13.00. Весткі.
15.00. "Прастора плюс".
15.30. Восень жыцця.
15.45. Міжнародны турнір па вольнай барацьбе. Кубак А.Мядзведзя.
16.30. Прадпрымальніцтва і традыцыі.
16.45. Т.Ін.Ка.
17.00. "Не рабіце жорсткімі сэрцы вашы".
17.30. Вольны час. "Дай лапу, сябар!"
17.45. Парламенцкі веснік Расіі.
18.00. "Расія і свет".
18.30. Крымінальныя весткі.
18.45. Дзеці Расіі.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Дак. кіно... Што далей?..
20.45. "Тры гісторыі Капенгагена".
20.55. Андрэй Козыраў у прэс-цэнтры "Рэспубліка".
22.00. Весткі.
22.25. "Жанчыны з сямейства Шарамецевых". Перадача 2-я.
22.55. "Англійскі гумар". Палітычны тэатр лялек.
23.30. Рок-група "Па-банку".

4, серада

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. "Веснавы турнір". Кінанарыс.
9.00. Музыка і спевы. 2-гі клас.
• 9.15. "Мільён у шлюбным кошыку". Маст. фільм
10.45. Ліра.
• 12.05. "Сакрэтны фарватар". Маст. фільм. 2-я серыя.
16.30. Навіны.
• 16.35. "Пунсовая кветачка". Мультфільм.
17.15. "Харэаграфічныя навелы". Фільм-канцэрт.
18.00. "Зямля Тарашкевіча". Дак. фільм.
18.30. "Праметэй". Фільм-балет.
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Гомель).
19.35. Наш каментарый. "Прызнанне".
19.40. Факты і меркаванні. "Пра што думаем і гаворым".
• 20.05. Хакей. "Дынама" (Мінск) – "Дынама" (Харкаў).
20.45. Калыханка.
21.00. Гандаль-дайджэст.
21.15. Абмяркоўваем праект Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Прымае ўдзел намеснік Старшыні ВС Беларусі В.І.Шаладонаў.
22.05. "Паўночны голас". Маст. фільм.
23.40. НіКа.

1 канал, Астанкіна

5.00. Раніца.
• 7.35. "Лясныя падарожнікі", "Найда". Мультфільмы.
• 8.10. Фільм-дзецям. "Вясёлыя сны, ці Смех і слёзы". 2-я серыя.
9.15. Разам з чэмпіёнамі.
9.30. "Ранак туманны". Фільм-канцэрт.
10.15. "Служэнне муз не церпіць мітусні..." Сяргей Алімаў.
11.00. Навіны.
11.25. Відавочнае-неверагоднае.
12.10. Дапамажы сам сабе.
12.40. Як дабіцца поспеху.
12.55. В.А.Моцарт. Фантазія до мінор. Выконвае С.Рыхтэр.
13.00. Блакнот.
13.10. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.25. Сёння і тады.
• 14.55. "Адзіны мужчына". Маст. фільм.1-я серыя.
16.00. Дзіцячы музычны клуб.
• 16.40. "Лабірынт". Мультфільм.
17.00. Навіны.
17.25. Прэм'ера рубрыкі "Максіма".
17.55. Рэформа: тыдзень за тыднем.
• 18.40. Фільмы рэжысёра Г.Данеліі. "Кін-дза-дза!" 1-я серыя.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
• 20.35. "Кін-дза-дза!" 2-я серыя.
21.40. Вячэрняе музычнае кафэ "Адлюстраванне".
23.00. Навіны.
23.25. "50x50". Тэлешоу.
23.55. Чэмпіянат і кубак СНД па спартыўнай гімнастыцы.
• 0.25. "Адзіны мужчына". Маст. фільм. 1-я серыя.

Канал "Расія"

7.00. Весткі.
7.20. Нямецкая мова. 1-ы год навучання.
7.50. Вольны час. "Калекцыянер".
8.05. Нямецкая мова. 2-гі год навучання.
8.35. "Расійскі бізнесмен-91".
10.55. Тэлефільм.
11.10. Андрэй Козыраў у прэс-цэнтры "Рэспубліка".
12.10. "Рэйн і Волга вачамі маладых".
13.00. Весткі.
15.00. Дзіцячая гадзіна (з урокам англійскай мовы).
16.00. "Тусоўка: біржавы варыянт".
16.25. Асабістая думка.
16.45. Т.Ін.Ка.
17.00. Тэлеагляд "Далёкі Усход".
17.45. Прыватызацыя парасійску.
18.00. Рэпартажы з ПАР. Перадача 2-я.
18.40. Весткі.
19.00. Футбол. Кубак еўрапейскіх чэмпіёнаў. "Дынама" (Кіеў) – "Барселона" (Іспанія). У перапынку – Свята кожны дзень.
20.50. Тварам да Расіі.
21.10. Свет мастацтва.
22.00. Весткі.
22.20. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
22.50. Канцэрт камернай музыкі.

5, чацвер

Беларускае тэлебачанне

8.45. "Паўночны голас". Маст. фільм. "Матылькі высакагор'я", "Сцежкамі запаведнымі". Дак. фільмы.
11.05. "Сакрэтны фарватэр". Маст. фільм. 3-я серыя.
Беларуская літаратура. 11-ы клас.
Запрашальны білет. Выступленне ўзорнага дзіцячага ансамбля "Калінка" г.Масквы.
18.00. "Маўклівая". Кінанарыс.
18.10. Якія мы гаспадары? Народнае прадпрыемства "Бабруйск-дрэў".
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Гродна).
19.35. Зачытайце маё пісьмо...
19.40. "Прымірэнне". Дак. фільм.
19.50. Тыдзень Беларускага ўрада.
20.05. Хакей. "Дынама" (Мінск) "Дынама" (Харкаў).
20.45. Калыханка.
21.00. Творчае маладзёжнае аб'яднанне "Крок" прадстаўляе... Студыя "КіТ".
23.25. НіКа.

I канал, Астанкіна

5.00. Раніца.
• 7.35. "Казка пра Бачо і яго маму". Мультфільм.
7.55. Дзіцячы музычны клуб.
• 8.25. Маст. фільм "Аэліта, не чапляйся да мужчын".
9.50. "Украінскія вячоркі". Фільм-канцэрт.
10.25. "Зыход". Дак. фільм.
11.00. Навіны.
11.20. У свеце жывёл.
12.05. Чалавек і закон.
12.45. Фермата.
13.15. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.25. Дак. фільм "Міласэрнасць і надзея".
• 14.45. "Адзіны мужчына". 2-я серыя.
• 15.55. Фільм – дзецям. "Электронная бабуля".
17.00. Навіны.
17.25. Кенес Жандыбаеў, рэфарматар.
17.40. ... Да 16 і старэйшым.
• 18.20. Маст. фільм "Аэліта, не чапляйся да мужчын".
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Дак. фільм "Сны наяве".
21.35. Фермата.
22.05. Былое.
23.00. Навіны.
23.25. "ВІД" прадстаўляе: "Эльдарада".
23.55. Міжнародны турнір па фул-кантакт каратэ і кікбоксінгу.
• 0.40. "Адзіны мужчына". 2-я серыя.

Канал "Расія"

7.00. Весткі.
7.20. Іспанская мова. 1-ы год навучання.
7.50. Вольны час. "Дамашні клуб".
8.05. Іспанская мова. 2-гі год навучання.
8.35. Дзіцячая гадзіна (з урокам англійскай мовы).
9.35. Тэлефільм.
10.00. Футбол. Кубак еўрапейскіх чэмпіёнаў. "Дынама" (Кіеў) – "Барселона" (Іспанія).
11.30. Зусім сакрэтна.
12.20. "Ляпсус".
13.00. Весткі.
15.00. "Футбол скрозь гады". Да юбілею М.П.Старасціна.
15.45. Г.Радзівонаў спявае рускія народныя песні.
16.00. "Хто ведае – вечнасць ці імгненне".
16.45. Т.Ін.Ка.
17.00. "Калі вам за..."
17.30. Вольны час. "Увага: здымаю!"
17.45. Парламенцкі веснік Расіі.
18.00. "У імя сына". Перадача 2-я.
18.40. Прашу слова.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Спецыяльны камерцыйны веснік.
19.40. "Сны пра Ізраіль". Фільм 1-ы.
20.30. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
20.55. Пятае кола.
22.00. Весткі.
22.25. Пятае кола. Працяг.
23.10. Фільм-канцэрт руска-амерыканскай поп-групы.

6, пятніца

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. "Беламорскія ўзоры". Кінанарыс.
9.00. Беларуская літаратура. 11-ы клас.
9.35. Вецер вандраванняў.
• 10.25. "Сакрэтны фарватэр". Маст. фільм. 4-я серыя.
15.25. Меркурый.
16.30. Навіны.
16.35. Праграма для падлеткаў і бацькоў. "Шлях да сябе".
• 17.35. "Нехачуха", "Бач ты, масленіца!", "Фэт Фрумас і сонца". Мультфільмы.
18.00. "Сустрэча з незнаёмкай". Навукова-папулярны фільм (ВМЗ).
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Магілёў).
19.35. Наш каментарый. "Спажывец і гандаль".
19.40. Аб партыях без дыпламатыі. Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі.
20.25. Калыханка.
20.45. Тэлебіржа.
• 21.00. "Даруй нам, першае каханне". Маст. фільм.
22.05. Нясконччаны партрэт. "Крупіцкія музыкі".
23.10. НіКа.

1 канал, Астанкіна

5.00. Раніца.
• 7.35. "У краіне нявывучаных урокаў", "Прыгоды Чапы". Мультфільмы.
8.15. ...Да 16 і старэйшым.
8.55. "Утрапёная Айседора". Фільм-канцэрт.
9.30. "Хто ёсць хто". Дак. фільм.
10.15. Гэта вы можаце.
11.00. Навіны.
11.25. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
12.20. "Сонцаварот". Спявае Л.Руміна.
• 13.00. "Лебедзь". Мультфільм.
13.15. Блакнот.
13.20. Брыдж.
13.45. Бізнес-клас.
14.00. Навіны.
• 14.25. "Фігурыстка". Маст. фільм.
16.05. Што азначаюць вашы імёны?
17.00. Навіны.
• 17.25. "Вецер у запас". Мультфільм.
17.40. Чалавек і закон.
• 18.20. "Мая сям'я і іншая жывёла". 8-я серыя.
18.50. "ВІД" прадстаўляе: "Поле цудаў".
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. "ВІД" прадстаўляе: "Пагляд", "Музагляд", "Шоу-біржа", Музыка. У перапынку (23.00.) – Навіны.
0.15. Акцёрская масленіца.
• 1.15. "Фігурыстка". Маст. фільм.

Канал "Расія"

7.00. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
8.20. Англійская мова. 1-ы год навучання.
8.50. Вольны час. "Увага, здымаю!"
9.05. Англійская мова. 2-гі год навучання.
9.35. "Бурда модэн" прапануе...
10.05. "Расійскі бізнесмен-91".
12.30. "Пра бізнес і пра сябе".
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. "Як жывеш, Уфа"?! Інфармацыйна-музычная перадача.
15.30. "Здабытак рэспублікі". Мастак Г.Чудакова.
16.00. Паралельныя сусветы.
16.45. Т.Ін.Ка.
17.00. "Прастора плюс".
17.30. Вольны час. "Дамашні клуб".
17.45. Версія.
18.00. "Астравы разладу. Погляд з Японіі". Частка 3-я.
18.30. Прашу слова.
• 18.45. Мультфільм.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Фестываль бальных танцаў.
• 20.05. Мультфільм.
20.15. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
• 20.45. "За цудоўных дам". Кінакамедыя.
22.00. Весткі.
22.25. "Маскі-шоу".
22.55. "Цішыня № 9". Святочны выпуск.

7, субота

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
• 8.40. Экран беларускага кіно. "Даруй нам, першае каханне". Маст. фільм.
9.45. Л.Шлег. "Загуканне вясны". Вакальна-сімфанічнае дзейства.
10.00. Паказвае Гродна. Мастацка-публіцыстычная праграма.
11.00. Тыдзень планеты. Міжнародны агляд.
11.15. Меркурый.
12.15. Асілак. Прамая лінія.
13.05. Мінская брама. Канцэрт Дзяржаўнага акадэмічнага народнага аркестра імя І.Жыновіча.
13.30. Бізнесклуб.
14.30. Сустрэча для вас. Наш госць – дырэктар навукова-практычнага цэнтра па разгрузачнай тэрапіі, кандыдат медыцынскіх навук Г.А.Вайтовіч. Прамая лінія.
15.30. Кінаэкран-92. Сакавік.
16.50. Дыялог. Прымае ўдзел намеснік Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь І.А.Кенік.
17.35. Літаратурны тэатр. "Не толькі пра каханне..." Па вершах беларускіх паэтаў.
18.00. Процістаянне. Маральна-прававая праграма.
19.00. Панарама.
19.25. Творчыя партрэты. Народная артыстка Рэспублікі Беларусь Наталля Гайда.
20.25. Калыханка.
20.45. Тэлебіржа.
• 21.00. "Вакзал для дваіх". Маст. фільм.
23.15. На музычных паралелях. Рамансы М.А.Рымскага-Корсакава выконвае Н.Руднева.
23.40. НіКа.

1 канал, Астанкіна

6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
• 7.35. Мультфільм.
7.45. ТБ-Нява прадстаўляе.
8.05. Усе любяць цырк.
8.50. Ранішняя музычная праграма.
9.20. Цэнтр.
10.00. Прадпрымальнік.
10.50. ЭХ.
11.05. Інстытут чалавека.
11.45. Музычны кіёск.
12.15. Пад знакам "пі".
13.05. "Мужчына маіх мрояў" (С.Сталяроў).
14.00. Навіны.
• 14.25. Тэл. маст. фільм "Ганчар і гаршчок".
15.55. Чырвоны квадрат.
• 16.35. Прэм'ера мультфільма "Пчала Мая".
17.00. Песні І.Нікалаева спявае І.Алеграва.
17.15. "Восем дзевак – адзін я". Аўтарская праграма Эльдара Разанава.
17.45. "Шчаслівы выпадак".
• 18.45. Прэм'ера тэл. маст. фільма "Папялушка-80". 1-я серыя.
19.45. Добрай ночы, малышы!.
20.00. Навіны.
• 20.40. "Папялушка-80". 2-я серыя.
21.40. "Да і пасля паўночы". У перапынку (23.00.) – Навіны.
2.00. Каханне з першага погляду. Дзень 1-ы.

Канал "Расія"

7.00. Весткі.
7.20. Крыніца.
7.55. Баскетбольны агляд НБА.
8.25. Фальклорная праграма "Свята".
8.55. "Супербабуля-91".
10.00. "Плюс адзінаццаць".
12.00. Пілігрым.
13.00. Весткі.
13.20. "Дом на Чыстых прудах".
14.50. Пецярбургскія магікане.
15.20. "Дэтэктыўная гісторыя пра Траццякоўскія шэдэўры".
15.40. Лясы.
16.20. М-трэст.
16.50. Што значыць "Іў Рашэ?". Касметыка з Францыі.
• 17.15. Шматсерыйны мультфільм "Прыгоды Боска".
17.45. Парламенцкі веснік Расіі.
18.00. Познер і Донах'ю.
18.55. Рэклама.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Тэатральны раз'езд. Вера Васільева.
20.45. "Мадмуазель Наталі". Конкурсна-забаўляльная праграма.
21.45. "Бізнес МН" прадстаўляе...
21.55. Рэклама.
22.00. Весткі.
22.20. Рэклама.
22.25. Праграма "А".

8, нядзеля

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. "Свята першае вясны". Канцэрт выхаванцаў дзіцячых садкоў Мінска.
• 9.15. "Вакзал для дваіх". Маст. фільм.
11.30. "Дом мажор". Да 60-годдзя Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі.
12.00. "Жыву і помню". Успамінае ветэран вайны, франтавая зенітчыца В.П.Чудаева.
12.40. "Чутно ў гуках паланеза..." З лістоў М.Агінскага да жонкі.
13.00. НіКа.
13.45. Тэлебом.
14.25. І.Губач. "Карсіканка". Спектакль.
16.40. Весьціца.
16.55. Паміж намі, жанчынамі...
18.05. "Ад і да".
18.20. "Бабулі-бабулечкі..." Конкурсная праграма.
19.00. Панарама.
19.20. Дабрачынны канцэрт. Тэатр песні А.Ціхановіча і Я.Паплаўскай.
20.20. Рэзерв.
20.25. Калыханка.
20.45. Запрашаем на вячоркі.
• 21.55. "Дамы запрашаюць кавалераў". Маст. фільм.
23.10. Танцуе народная артыстка Беларусі Л.Бржазоўская.

1 канал, Астанкіна

7.00. Рытмічная гімнастыка.
7.30. Тыраж "Спортлапо".
7.45. Спорт для ўсіх.
8.15. Раным-рана.
8.55. Магчыма ўсё.
9.25. IX Міжнародны фестываль тэлевізійных праграм народнай творчасці "Вясёлка". "Калекцыя кітайскіх танцаў".
10.05. Ранішняя зорка.
10.55. "Суперлэдзі". Жаночае пяцібор'е.
11.25. "Лёсам дараваныя сустрэчы". Успамінае А.Гогалева.
• 12.25. "Лімпапо".
• 12.55. Шматсерыйны маст. фільм "Багатыя таксама плачуць".
14.00. Навіны.
14.20. Дыялог у прамым эфіры.
15.05. Марафон-15.
15.55. Клуб падарожнікаў.
• 16.55. Уолт Дысней прадстаўляе...
17.45. Навіны.
18.00. Тэлелоцыя.
18.10. "Восем дзевак – адзін я". Аўтарская праграма Эльдара Разанава.
18.40. "ТБ-Нява" прадстаўляе. "Хто з намі?". У падтрымку фермерскага руху.
• 19.00. "Папялушка-80". 3-я і 4-я серыі.
21.00. Вынікі.
21.50. "Кабарэ". У перапынку (23.00.) – Навіны.
23.50. ІТВА "Астра" прадстаўляе: "Эстрада". Рос-артыстычная біржа.
0.50. Каханне з першага погляду. Дзень 2-гі.

Канал "Расія"

7.00. Весткі.
7.20. Дакументальны экран Расіі.
8.05. "Хочаце, верце..." Тэлекрасворд.
8.35. "Масленіца".
9.15. Прызнанне ў каханні.
9.30. Дыялогі дылетантаў.
• 10.00. "Суперкніга". Мультфільм. 3-я серыя.
10.25. Аты-баты...
11.00. Тэлеасамблея.
11.50. Тэлефільм.
12.00. ЦСКА: успаміны пра "залаты" сезон.
13.00. Весткі.
13.20. Паэт Ганна Баркова.
• 13.50. Мультфільм.
14.00. Белая варона.
14.45. "Нясмелыя надзеі ў цяжкі час".
15.00. Фартуна.
16.00. У свеце жывёл.
17.00. Чэмпіянат свету па баскетболу сярод прафесіяналаў НБА.
18.00. "Дзелавая жанчына" ў гасцях у "Мужчынскага клуба".
18.55. Рэклама.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
• 19.30. Прэм'ера шматсерыйнага маст. фільма "Магі". Фільм 1-ы "Узбунтаваны склеп".
20.00. Рэтра. Музычная праграма.
20.40. Тварам да Расіі.
21.00. "Прысвячэнне Паварoці". Канцэрт.
21.55. Рэклама.
22.00. Весткі.
22.30. Спартыўная карусель.
23.20. Рок-кафэ.

Так мы пазначылі мультыплікацыйныя і мастацкія фільмы, каб зэканоміць Ваш час.

Малюнак Д. Янцэва.

Умовы завочнага клуба знаёмстваў

Разам з пісьмом у рэдакцыю неабходна даслаць квітанцыю аб аплаце: за кожны адрас зацікавіўшага вас абанента або ліст да яго – два рублі. Калі вы хочаце ўбачыць надрукаваным у "Перапісцы" толькі свой адрас – 5 рублёў. За пісьмо, змешчанае ў рубрыцы знаёмстваў, – 20 рублёў.

Грошы пералічваюцца на разліковы рахунак "Чырвонай змены" № 345480 (код 811) у Беларускім прамыслова-інавацыйным банку г. Мінска, за межамі рэспублікі – № 811161700 у Гарупраўленні Дзяржбанка г. Мінска МФО 400417, абавязкова з паметкай "Перапіска" (гэта можна зрабіць у любым паштовым аддзяленні або ў ашчадным банку).

Рэдакцыя прадастаўляе льготы ваеннаслужачым. Яны могуць уносіць або не ўносіць плату па ўласнаму жаданню. Але друкуюцца ў першую чаргу лісты, да якіх прыкладзена квітанцыя.

Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць тэксты пісьмаў пры падрыхтоўцы да друку. Пісьмы без зваротнага адраса друкавацца не будуць.

* * *

● Добры дзень, паважаная рэдакцыя газеты "Чырвоная змена".

Пішуць вам дзве сяброўкі Светы. У нас многа сяброў, але хочацца мець яшчэ больш, і таму мы вырашылі напісаць у вашу газету. Спадзяёмся, што вы дапаможаце нам іх знайсці.

Нам па 16 гадоў, слухаем музыку, ходзім у кіно, любім чытаць.

Калі вы надрукуеце наш ліст, будзем вельмі ўдзячныя. Наш адрас: *222410, г.Вілейка, вул.Першамайская, д.80, блок 409. Івашкевіч Святлана, Аляксандровіч Святлана.*

* * *

● Паважаная рэдакцыя!

Прашу апублікаваць маю аб'яву наступнага зместу:

Малады інтэлігентны чалавек (28/175) з вышэйшай адукацыяй, спакойны, сур'ёзны, працавіты, аптыміст і крыху рамантык жадае пазнаёміцца са сціплай сімпатычнай дзяўчынай, славянкай, гараджанкай, якая не мае шкодных звычак, верыць у існаванне высокага ўзаемнага кахання і якая не баіцца ніякіх цяжкасцей. Пішыце па адрасу: *222310, Мінская вобл., г.Маладзечна-4, да запатрабавання ўладальніку пашпарта VII-ОК № 732025.*

* * *

● Паважаная рэдакцыя!

Вельмі хацеў бы праз вашу газету знайсці сабе жанчыну ва ўзросце 25–30 год для сумеснага жыцця. Сам я з 1958 г., працую ў леспрамгасе трактарыстам. Калі якая-небудзь жанчына жадае працягнуць мне сваю жаночую руку, то няхай напіша па адрасу: *247993, Гомельская вобл., Жыткавіцкі раён, Азеранскі с/савет, пас.Хвоенск, Батайчуку Васілю Уладзіміравічу.*

* * *

● Чакаю лістоў ад тых, хто здольны зразумець і дараваць.

213410, г.Горкі Магілёўскай вобл., УЖ 15/9-4, Крывянкову Віктару.

* * *

● Добры дзень, паважаная рэдакцыя. Мы вельмі жадаем знайсці сяброў і сябровак з розных куткоў Беларусі. І будзем вельмі ўдзячныя вам, калі дапаможаце. Нам па 17 гадоў. Падабаецца слухаць музыку, хадзіць на дыскатэку, карацей кажучы, весела праводзіць час.

222410, г.Вілейка Мінскай вобл., вул.1 Мая, 80, п.403, Тацццяна, Марыя і Ірына.

* * *

● Паважаная рэдакцыя! Хачу папрасіць вас надрукаваць мой ліст.

Хацеў бы пазнаёміцца з дзяўчынай, у якой былі б добрае сэрца і душа, якая магла б стаць вернай жонкай і добрай гаспадыняй у доме. Знешнасць і ўзрост вялікай ролі не адыгрываюць.

Мне 22 гады, рост 186, прыемнай знешнасці, характар мяккі. Працую шафёрам. Жыву з бабуляй, бацькоў няма. Умею цаніць вернасць і клапатлівыя адносіны. Шмат чаго магу рабіць уласнымі рукамі. Маю шэраг іншых карысных захапленняў. Алкаголь не ўжываю і не куру. Хацеў бы, каб адгукнулася тая дзяўчына, якая б хацела жыць і працаваць у вёсцы. Буду вельмі ўдзячны тым, хто мне напіша.

211955, Віцебская вобл., Міёрскі раён, п/а Папшулі, в.Румполле. Сташкевічу Івану.

* * *

● Добры дзень, "Чырвоная змена"!

Я хачу знайсці сабе вернага сябра. Трохі пра сябе: мне 15 гадоў, вучуся ў 9 класе. Валасы русыя, рост 162. Займаюся эстраднымі танцамі. Мой адрас: *222320, Мінская вобл., Маладзечанскі раён, в.Краснае, зав.Неміро, д.2. Луцкая Света.*

* * *

● Паважаная рэдакцыя газеты "Чырвоная змена".

Спадзяюся, што з вашай дапамогай змагу знайсці сяброў і сябровак з розных куткоў Беларусі.

Напішу крыху пра сябе. Маё імя Наташа. Мне 16 гадоў. Падабаецца сучасная музыка. Люблю хадзіць на дыскатэкі, у кіно, чытаць мастацкую літаратуру. Вельмі буду ўдзячна, калі вы надрукуеце маё пісьмо і адрас: *223710, г.Салігорск Мінскай вобл., вул.Кастрычніцкая, д.73, кв.17, Уласенка Наталлі.*

* * *

● Мяне завуць Вольгай. Мне 19 гадоў. Хачу знайсці сяброў па перапісцы. Мой адрас: *Мінская вобл., Маладзечанскі раён, п/а Радашковічы, в.Валадзькі, вул.Юбілейная, д.2, кв.2. Самусёва Вольга.*

* * *

● Добры дзень, шаноўная рэдакцыя "Чырвонай змены".

Я хачу мець сябровак па перапісцы, якія любяць сучасную музыку і захапляюцца творчасцю Ж.Белавусава і А.Глызіна.

247824, Гомельская вобл., Ельскі раён, п/а Скароднае, в.Дзяміды, Залезка Ірыне.

* * *

● Прывітанне, "Чырвоная змена"!

З тваёй дапамогай я жадаю знайсці сабе вернага сябра.

Крыху пра сябе: мне 15 гадоў, вучуся ў 9 класе, валасы русыя, рост 161 см. Займаюся эстраднымі танцамі. Збіраю здымкі Цоя і Талькова.

Мой адрас: *222320, Мінская вобл., Маладзечанскі раён, в.Краснае, зав.Карбышава, д.3, кв.21, Багдановіч Эльвіры Анатольеўне.*

* * *

● Прашу вас апублікаваць у рубрыцы "Перапіска" наступную аб'яву:

30/170/67. Маю прыемны знешні выгляд, вышэйшую медыцынскую адукацыю, уласную жылплошчу ў Мінску. Вочы карыя, валасы цёмна-русыя. Беларус. Не куру, не ўжываю алкагольных напіткаў. Жанаты не быў.

Пазнаёмлюся з прыгожай дзяўчынай ростам 150-160 см. Адкажу на ліст з фотаздымкам.

Мой адрас: *220103, Мінск-103, абан.скрынка 45. Язерскаму Андрэю Сяргеевічу.*

Падрыхтавала Майя Шэндрык. (Тэл.32-50-01).

Кінаафіша

"Якаў, сын Сталіна"

Новую каляровую мастацкую кінастужку з такой назвай, створаную рэжысёрам Дэві Абашыдзе па сцэнарыю, які ён напісаў у садружнасці з Бадры Чаханэлідзе, прадстаўляе на суд гледача кінастудыя "Грузія-фільм".

У аснову фільма пакладзена біяграфія Якава Іосіфавіча Джугашвілі. Цень яго бацькі суправаджаў гэтага мяккага і далікатнага чалавека ўсё яго кароткае жыццё. У ролі Якава Джугашвілі зняўся Заза Калелішвілі, у ролі Іосіфа Сталіна — унук "бацькі народаў", кандыдат гістарычных навук, дацэнт Акадэміі імя Фрунзе палкоўнік Яўген Якаўлевіч Джугашвілі.

"Заложніца"

Злачынца па прозвішчу Брытанаў, які ўцёк з зоны, на пустой загараднай шашы захапіў аўтамабіль. У ім знаходзілася дзяўчына — Людміла Вятвінава. Так яна апынулася заложніцай у руках зэка...

Уцякач і заложніца едуць да мяжы. На іхнім шляху сустракаецца пусты паляўнічы домік. Брытанаў вырашае крыху адпачыць. Якраз тут і адбываецца нараджэнне паміж героямі светлага пачуцця.

Але набліжаецца крывавая развязка. Фільм зняты на Адэскай кінастудыі. Рэжысёр — Сяргей Ашкеназі.

У фільме здымаліся Альгіс Матуленіс, Аляксандра Захарава, Юрый Кузьмянкоў, Аляксандр Якаўлеў і іншыя.

"Спрытнюга і хіпоза"

Новую каляровую мастацкую кінастужку з такой назвай зняў на кінастудыі "Масфільм" Сяргей Бялошнікаў па свайму сцэнарыю.

Шафёр Спрытнюга (яго мянушка) узяўся пераганяць прыватную легкавую машыну ў паўднёвы горад. Па дарозе да яго падсела выпадковая спадарожніца — маладая рыжавалосая дзяўчына Лена.

Аднак не спяшайцеся настройвацца на гісторыю кахання, народжаную пад гук тармазоў. "Страва" яшчэ не гатова. Да каліва кахання і жменькі авантур трэба дадаць поўную шклянку крыміналу.

Галоўныя ролі выконваюць Яўген Карэльскіх, Жанна Эпле, Уладзімір Шавялькоў, Валерый Яроменка, Дзмітрый Шчаглоў.

Дзяжурны рэдактар А. АГІБАЛАВА.

Мастацкае афармленне нумара В. ДУБОВІКА.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Заснавальнік: ЦК ЛКСМБ
Выдавец: газетна-выдавецкая фірма "Белая Русь"
Газета ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.
АДРАС рэдакцыі: 220041, г.Мінск, праспект Скарыны, 77.
ТЭЛЕФОНЫ: 32-13-54, 32-50-01.
Газета набрана і звярстана ў наборна-выдавецкім бюро газетна-выдавецкай фірмы "Белая Русь".
Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку", г. Мінск.
Індэкс 63906. Тыраж 19 050

Галоўны рэдактар Уладзімір БЕЛЬСКІ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Алена АГІБАЛАВА, Валерый ВАРАНЕЦКІ, Валерый ІВАНОЎ, Алег КАМІНСКІ (першы нам. гал. рэдактара), Віктар ЛЮКОВІЧ, Мікалай ЛАРКОВІЧ, Алесь МАСАРЭНКА, Станіслаў НІЧЫПАРОВІЧ, Алесь ПАЛЫНСКІ, Наталля ПЛЫТКЕВІЧ, Павел СІМАНАЎ (нам. гал. рэдактара), Алег СЛУКА, Кузьма ШАПЛЫКА.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных звестак, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася звестак, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

Зак. № 9.

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12